OSCE

АБСЕ

**Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека**

**РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ**

# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ
**17 кастрычніка 2004 года**

## Выніковая справаздача
## Місіі БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за выбарамі

Office for Democratic Institutions and Human Rights

OSCE ODIHR

**Варшава**
**9 снежня 2004 года**

# ЗМЕСТ

**I. АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ……1**

**II. УВОДЗІНЫ І СЛОВЫ ПАДЗЯКІ……3**

**III. ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ……3**

**IV. ПРАВАВАЯ АСНОВА……4**

**V. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ……5**
A. Выбарчыя камісіі……5
B. Правядзенне выбараў……6
C. Спісы выбаршчыкаў……7

**VI. РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ……8**
A. Вылучэнне……8
B. Рэгістрацыя……10
C. Скаргі, зняцце сваіх кандыдатур і скасаванне рэгістрацыі……12
D. «Супраць усіх»……13

**VII. ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ……13**

**VIII. СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ……16**
A. Агульныя звесткі аб СМІ ў Рэспубліцы Беларусь……16
B. Парадак выкарыстання СМІ……16
C. Маніторынг СМІ……17

**IX. УДЗЕЛ ЖАНЧЫН……20**

**X. ПЫТАННІ, ЗВЯЗАНЫЯ З УДЗЕЛАМ МЕНШАСЦЯЎ У ВЫБАРЧЫМ ПРАЦЭСЕ……20**

**XI. УНУТРАНЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ……20**

**XII. НАЗІРАННЕ ЗА ГАЛАСАВАННЕМ І ПАДЛІКАМ ГАЛАСОЎ……21**
A. Датэрміновае галасаванне……21
B. Галасаванне ў дзень выбараў……22
C. Падлік галасоў……23
D. Падвядзенне вынікаў……23
E. Перашкаджэнне працы назіральнікаў ад АБСЕ……24

**XIII. ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ……25**

**XIV. РЭКАМЕНДАЦЫІ……26**
A. Прававая аснова……26
B. Арганізацыя і правядзенне выбараў……27
C. Рэгістрацыя кандыдатаў……28
D. Перадвыбарчая агітацыя……29
E. СМІ……29
F. Спісы выбаршчыкаў……30
G. Працэдуры галасавання……30
H. Назіральнікі……31

**ІНФАРМАЦЫЯ АБ БДІПЧ/АБСЕ……32**

**РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ**
**ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ**
**17 кастрычніка 2004 года**

**Выніковая справаздача[1]**
**Місіі БДІПЧ/АБСЕ па назіранні за выбарамі**

# I. АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ

У адказ на своечасовае запрашэнне Міністра замежных спраў Рэспублікі Беларусь Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) АБСЕ правяло назіранне за выбарамі ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якія адбыліся 17 кастрычніка 2004 года. БДІПЧ/АБСЕ ацэньвала выбары наконт іх адпавядання Капенгагенскаму дакументу АБСЕ 1990 года, нацыянальнаму заканадаўству і іншым абавязальніцтвам, звязаным з выбарамі.

Пасля прызначэння парламенцкіх выбараў было абвешчана аб правядзенні рэспубліканскага рэферэндуму аб унясенні змяненняў у Канстытуцыю, якія прапаноўваліся для зняцця абмежавання адносна мажлівасці займаць пасаду Прэзідэнта не больш за два тэрміны, які таксама адбыўся 17 кастрычніка. Нягледзячы на тое, што БДІПЧ/АБСЕ атрымала запрашэнне весці назіранне за рэферэндумам, Бюро прыняла рашэнне толькі ўлічваць рэферэндум у той ступені, у якой ён аказваў уплыў на парламенцкія выбары. Адпаведна, нягледзячы на тое, што БДІПЧ/АБСЕ і не прадстаўляе прамых высноваў аб рэферэндуме ў асобнасці, ён згадваецца ў дадзенай справаздачы. Рэферэндум у значнай меры адсунуў на другі план кампанію па парламенцкіх выбарах, і існавала прынцыповая ўзаемасувязь паміж арганізацыяй парламенцкіх выбараў і рэферэндуму. Пытанні, выклікаўшыя заклапочанасць падчас адной кампаніі, поўнасцю датычацца і другой.

Парламенцкія выбары ў Рэспубліцы Беларусь 17 кастрычніка ў значнай меры не адпавядалі абавязальніцтвам АБСЕ. Быў кінуты сур'ёзны выклік усеагульным прынцыпам і гарантаваным Канстытуцыяй правам на самавыражэнне і свабодам аб'яднанняў і сходаў, што ставіць пад сумненне гатоўнасць беларускіх уладаў паважаць прынцып палітычнай канкурэнцыі на падставе роўнасці. Выклікае заклапочанасць і зробленае падчас выбарчай кампаніі Прэзідэнтам Лукашэнка сцвярджэнне аб тым, што Канстытуцыя і заканадаўства Рэспублікі Беларусь утрымліваюць «элементы аўтарытарызму». Беларускія ўлады не здолелі стварыць умоваў для забеспячэння таго, каб волевыяўленне народа стала асновай улады ўрада, што з'яўляецца адным з асноватворных абавязальніцтваў Капенгагенскага дакумента 1990 года.

Нягледзячы на тое, што працэдуры галасавання ў дзень выбараў наогул прайшлі паводле дзеючага заканадаўства, мелі месца сур'ёзныя неадпаведнасці, звязаныя з галасаваннем, асабліва падчас падліка галасоў і на працягу пяцідзённага перыяду датэрміновага галасавання. Недахопы заканадаўчай базы пагаршаліся абмежавальным і адвольным ужываннем заканадаўства і незабеспячэннем Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў аднастайнага працэдурнага парадку. Прынцыпы ліберальнага дэмакратычнага працэсу, паводле якіх грамадзяне маюць права прэтэндаваць на палітычныя пасады, не падвяргаючыся дыскрымінацыі, кандыдаты - бесперашкодна прадстаўляць свае погляды, а выбаршчыкі – даведвацца пра іх і свабодна іх абмяркоўваць, былі ў значнай ступені праігнараваныя.

[1] Дадзены дакумент з'яўляецца перакладам справаздачы на беларускую мову, але версія на англійскай мове застаецца адзінай афіцыйнай версіяй.

Усталяванае заканадаўствам патрабаванне незалежнай ад дзяржавы і мясцовай адміністрацыі дзейнасці выбарчых камісій не выконвалася, з прычыны чаго ролі выбарчых камісій на ўсіх узроўнях і дзяржаўнай адміністрацыі шчыльна перапляліся. Выбарчы кодэкс не забяспечыў сбалансаванага прадстаўніцтва праўрадавых і апазіцыйных палітычных сілаў у складзе выбарчых камісій. У выніку гэтага ўдзел палітычных партый у працы выбарчых камісій, надзвычай неабходны для забеспячэння празрыстасці і даверу да выбарчага працэсу, быў вельмі абмежаваным.

Маргіналізацыя палітычных партый у выбарчым працэсе таксама выявілася ў арганізацыі і правядзенні выбараў такім чынам, калі актыўна выключаліся кандыдаты, якія прадстаўлялі рознабаковыя інтарэсы. Калі праўрадавыя партыі былі ледзь прыкметныя і не вылучылі значнай колькасці кандыдатаў, то кампаніі апазіцыйных партый былі падарваныя ў выніку неабгрунтаваных адмоваў у рэгістрацыі патэнцыйным кандыдатам, а часам і беспадстаўнага скасавання рэгістрацыі, з прычыны чаго павузіўся выбар выбаршчыкаў. Большасць праўрадавых кандыдатаў былі вылучаныя ад працоўных калектываў або шляхам самавылучэння, што аказала дадатковае негатыўнае ўздзеянне на выбарчы працэс, у цэнтры якога апынуліся індывідуальныя кандыдаты, а не партыі з іх уласнымі і разнастайнымі платформамі.

Залішне абмежавальны характар правілаў вядзення агітацыі пагаршаўся выпадкамі дыскрымінацыі з мэтай падтрымкі асобных кандыдатаў і супраць кандыдатаў ад апазіцыі. Асвятленне выбараў у СМІ не дазволіла адбыцца сапраўдным дэбатам. Абмежаванай колькасці бясплатнага эфірнага часу на тэлебачанні і радыё для кожнага кандыдата і магчымасці бясплатнай публікацыі сваёй праграмы ў дзяржаўных друкаваных выданнях было недастаткова для таго, каб пераадолець моцную прадузятасць, прадэманстраваную дзяржаўнымі СМІ, якія прадстаўлялі апазіцыю пераважна з адмоўнага боку і праводзілі шырокамаштабную кампанію ў падтрымку знаходзячыхся ва ўладзе палітычных сілаў і пытання, вынесенага на рэспубліканскі рэферэндум.

Неабмежаваны ўхіл у бок кампаніі па рэферэндуме і яе нерэгулюемае пранікненне нават на ўчасткі для галасавання спрыялі стварэнню моцна скажонай атмасферы выбарчай кампаніі. Па меры таго, як набліжаўся дзень выбараў, вобыскі органамі міліцыі перадвыбарчых штабоў, затрыманне аднаго з кандыдатаў, затрыманне і прыгнёт актывістаў перадвыбарчай кампаніі і ўнутраных назіральнікаў, а таксама выпадкі прымусу асобных групаў выбаршчыкаў, асабліва студэнтаў, да ўдзела ў галасаванні, звесткі аб якіх паступалі з розных рэгіёнаў, стваралі атмасферу страху.

Працэсы галасавання і падліку галасоў пацвердзілі заклапочанасць у сувязі з адсутнасцю належным чынам усталяваных працэдур і гарантый празрыстасці, што спрыяла працэдурным пралікам і наўмысным злоўжыванням. Працэдура пяцідзённага датэрміновага галасавання прайшла пры адсутнасці асобнага ўліку яўкі выбаршчыкаў і вынікаў датэрміновага галасавання і палажэнняў аб забеспячэнні недатыкальнасці скрыняў для галасавання і іншых матэрыялаў па выбарах такім чынам, які б выклікаў поўны давер выбаршчыкаў. На некаторыя групы выбаршчыкаў аказваўся ціск для таго, каб яны прагаласавалі датэрмінова, улічваючы студэнтаў, вайскоўцаў і працоўныя калектывы.

Пасля зачынення выбарчых участкаў 17 кастрычніка выявіліся праблемы пры падліку галасоў: на большасці назіраўшыхся ўчасткаў для галасавання бракавала празрыстасці, і не выконвалася працэдура складання пратаколаў. Сапраўдны аналіз працэса падвядзення вынікаў стаў немагчымым з-за вельмі сур'ёзнага перашкаджэння працы міжнародных назіральнікаў з боку акруговых выбарчых камісій (АВК).

Дэманстрацыі пратэсту, праведзеныя апазіцыяй у Мінску непасрэдна пасля парламенцкіх выбараў і рэспубліканскага рэферэндуму, былі разагнаныя сілай, што пацвердзіла панаванне атмасферы абмежавання асноватворных правоў, такіх як свабода самавыражэння і свабода сходаў.

БДІПЧ/АБСЕ пацвярджае сваю прыхільнасць аказваць садзейнічанне ўладам і грамадзянскай супольнасці Беларусі ў пераадольванні перашкодаў на шляху да правядзення дэмакратычных выбараў. БДІПЧ/АБСЕ заклікае беларускія ўлады пайсці насустрач і стварыць у Рэспубліцы Беларусь умовы для паўнавартаснага дэмакратычнага выбарчага працэсу.

## II. УВОДЗІНЫ І СЛОВЫ ПАДЗЯКІ

Выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь адбыліся 17 кастрычніка 2004 года, улічваючы пяць дзён датэрміновага галасавання, прайшоўшага з 12 па 16 кастрычніка[2]. 2 верасня 2004 года БДІПЧ/АБСЕ заснавала Місію па назіранні за выбарамі (МНВ). БДІПЧ/АБСЕ жадала бы выказаць беларускім уладам удзячнасць за своечасовае запрашэнне, якое дазволіла правесці першую стандартную поўнамаштабную МНВ БДІПЧ/АБСЕ ў Рэспубліцы Беларусь. МНВ БДІПЧ/АБСЕ, якую ўзначальвала пасол Одры Гловэр (Вялікабрытанія), складалася з 12 членаў асноўнага складу і 22 доўгатэрміновых назіральнікаў з 17 дзяржаў-удзельніц АБСЕ, накіраваных ў Мінск і восем іншых гарадоў, чыя дзейнасць ахоплівала ўсе 110 выбарчых акругаў.

Напярэдадні дня выбараў да МНВ БДІПЧ/АБСЕ далучыліся кароткатэрміновыя назіральнікі, у тым ліку дэлегацыя з каля 50 назіральнікаў ад Парламенцкай Асамблеі АБСЕ (ПА АБСЕ), запрошаная Старшынёй Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, якая ўзначальвалася спадарыняй Тоне Цінгсгаард (Швецыя), Віцэ-прэзідэнтам Парламенцкай Асамблеі АБСЕ, прызначанай Дзеючым старшынёй АБСЕ Спецыяльным каардынатарам кароткатэрміновых назіральнікаў АБСЕ. БДІПЧ/АБСЕ і ПА АБСЕ накіравалі 270 назіральнікаў з 37 дзяржаў-удзельніц АБСЕ для назірання за працэдурамі датэрміновага галасавання і галасавання ў дзень выбараў у рамках Міжнароднай місіі па назіранні за выбарамі.

БДІПЧ/АБСЕ жадае выказаць сваю ўдзячнасць Міністэрству замежных спраў, Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў і іншым дзяржаўным органам Рэспублікі Беларусь за праяўленае супрацоўніцтва і аказанае садзейнічанне.

## III. ПАЛІТЫЧНАЯ СІТУАЦЫЯ

Выбары ў Палату прадстаўнікоў 17 кастрычніка 2004 года сталі другімі парламенцкімі выбарамі, праведзенымі па Канстытуцыі 1996 года. Дэпутаты абіраліся па 110 аднамандатных выбарчых акругах на падставе мажарытарнай сістэмы на чатырохгадовы тэрмін. Дэпутатамі станавіліся кандыдаты, якія атрымоўвалі больш за 50 працэнтаў галасоў у першым туры выбараў, прызнаных адбыўшыміся (паводле азначэння, калі яўка выбаршчыкаў перавышае 50 працэнтаў). У акругах, дзе першы тур прызнаных адбыўшыміся выбараў не выявіў пераможцу адразу, два кандыдаты, якія набралі найбольшую колькасць галасоў, праходзілі ў другі тур, які праводзіўся праз два тыдні.

---

[2] Датэрміновае галасаванне праходзіла штодзённа з 10:00 да 14:00 і з 16:00 да 19:00. Акрамя таго, 27 кастрычніка ў адной з выбарчых акругаў у Віцебскай вобласці адбыўся другі тур галасавання (гл. раздзел XIII, ніжэй). БДІПЧ/АБСЕ назіранне за ім не праводзіла.

Выбары праходзілі ў напружаным палітычным становішчы. 7 верасня Прэзідэнт Лукашэнка аб'явіў аб правядзенні адначасова з парламенцкімі выбарамі рэспубліканскага рэферэндуму. Грамадзяне галасавалі па пытанні аб дазволе дзеючаму Прэзідэнту ўдзельнічаць у наступных прэзідэнцкіх выбарах і зняцці канстытуцыйнага абмежавання адносна мажлівасці займаць пасаду Прэзідэнта не больш за два тэрміны. Рэферэндум яўна адсунуў парламенцкія выбары на другі план, як у сэнсе актыўнасці правядзення адпаведнай агітацыі, так і ў сэнсе адноснай важнасці, якую надавалі дзвюм дадзеным падзеям палітычныя дзеячы ўсяго палітычнага спектру.

## IV. ПРАВАВАЯ АСНОВА

Акрамя агульных палажэнняў аб выбарах, якія змяшчаюцца ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, асноўным законам для правядзення выбараў у Палату прадстаўнікоў з'яўляецца Выбарчы кодэкс, зацверджаны Парламентам 24 студзеня 2000 года, са змяненнямі ад 22 чэрвеня 2000 года. Асобную значнасць маюць таксама законы «Аб палітычных партыях» ад 5 кастрычніка 1994 года і «Аб друку і іншых сродках масавай інфармацыі» ад 13 студзеня 1995 года, роўна як і Грамадзянска-працэсуальны кодэкс ад 11 студзеня 1999 года ў дачыненні да апеляцый і скаргаў, звязаных з працэдурамі рэгістрацыі палітычных партый і кандыдатаў.

Увогуле, прававая база не стала належнай асновай для паўнавартаснага дэмакратычнага выбарчага працэсу. Як ужо раней адзначалася БДІПЧ/АБСЕ, Выбарчы кодэкс абмяжоўвае грамадзянскія і палітычныя правы і не змяшчае належных гарантый палітычнага плюралізму і празрыстасці, з прычыны чаго не можа гарантаваць дакладнасці выбарчага працэсу. З боку БДІПЧ/АБСЕ былі прапанаваныя рэкамендацыі і аказана садзейнічанне па прывядзенні Выбарчага кодэксу ў больш цеснае адпавяданне з абавязальніцтвамі АБСЕ[3], аднак беларускія ўлады дадзеныя рэкамендацыі не выканалі.

Да парламенцкіх выбараў 2004 года БДІПЧ/АБСЕ таксама рэкамендавала ЦВК прыняць дадатковыя пастановы для ўрэгулявання шэрагу заставаўшыхся нявырашанымі пытанняў. Тым не менш, дадзеныя пастановы, якія б стварылі неабходныя гарантыі, прынятыя не былі, а пастановы, прынятыя ЦВК, былі недастатковымі для растлумачэння асноватворных аспектаў выбарчага працэсу і, такім чынам, не забяспечвалі яго аднастайнага парадку (гл. раздзел V: Арганізацыя і правядзенне выбараў).

Некаторыя прававыя палажэнні выкарыстоўваліся для абмежавання палітычнага ўдзелу ў выбарчым працэсе. Дадзеныя палажэнні, часцей за ўсё, ужываліся адвольным чынам замест выкарыстання іх для замацавання палітычных правоў патэнцыйных кандыдатаў.

Артыкулам 67 Выбарчага кодэксу рэгламентуецца працэдура праверкі подпісаў, сабраных для рэгістрацыі самастойна вылучаючыхся прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат. Пяцідзесяці тром прэтэндэнтам АВК адмовілі ў рэгістрацыі на падставе занадта вялікай колькасці несапраўдных подпісаў, нават нягледзячы на тое, што ў некаторых выпадках існавалі доказы адвольнага ўжывання АВК крытэраў сапраўднасці подпісаў і працэдуры ўзяцця выбаркі. Гэта вылілася ў пільнае вывучэнне лістоў з мэтай атрымання неабходнай колькасці несапраўдных подпісаў, нават калі кандыдаты збіралі нашмат больш подпісаў, чым было неабходна.

[3] Асабліва ў дачыненні да: забеспячэння незалежнасці і прадстаўнічасці выбарчых камісій; зняцця абмежаваннняў на вядзенне агітацыі; празрыстага рэгулявання датэрміновага галасавання і яго ўліку; забеспячэння дакладнасці вынікаў галасавання і празрыстасці пры іх падвядзенні; гарантавання правоў назіральнікаў; і прадастаўлення належных правоў абскарджвання рашэнняў ЦВК.

У адпаведнасці з артыкуламі 100 і 101 Выбарчага кодэксу патэнцыйныя кандыдаты павінны прадставіць дэкларацыю аб даходах і маёмасці. У шэрагу выпадкаў разыходжанні паміж лічбамі, указанымі кандыдатам, і лічбамі, атрыманымі АВК у працадаўцаў і з іншых крыніцаў, выкарыстоўваліся для дыскваліфікацыі кандыдата, нават калі памылка адбылася не яго віне, без прадастаўлення яму ў далейшым магчымасці ўнесці выпраўленні ў дакументы на рэгістрацыю.

Палітычныя партыі ў Беларусі павінны мець зарэгістраваную партыйную арганізацыйную структуру («першасную арганізацыю») у выбарчай акрузе, па якой яны жадаюць вылучыць кандыдата. У апошні дзень рэгістрацыі, 16 верасня 2004 года, шэраг мясцовых упраўленняў Міністэрства юстыцыі знялі з уліку некалькі «першасных арганізацый», пазбаўляючы партыі права вылучаць у дадзеных акругах кандыдатаў. Магчымасць абскардзіць дадзеныя рашэнні ў тэрмін - да апошняга дня рэгістрацыі - адсутнічала.

Артыкул 47 усталёўвае санкцыі за парушэнне правілаў вядзенні агітацыі, звязаных з абразай Прэзідэнта і іншых службовых асобаў дзяржавы або з подкупам выбаршчыкаў. Некалькі ўжо зарэгістраваных кандыдатаў былі ананімным чынам абвінавачаныя ў такіх парушэннях і пасля знятыя з перадвыбарчай гонкі ў апошнія дні перад выбарамі. Сярод іншых мелі месца выпадкі скасавання рэгістрацыі за такія неістотныя дзеянні, як распаўсюд газет або ўлетак нібыта зневажальнага зместу. ЦВК адхіліла ўсе скаргі з нагоды такіх выпадкаў скасавання рэгістрацыі.

## V. АРГАНІЗАЦЫЯ І ПРАВЯДЗЕННЕ ВЫБАРАЎ

### A. Выбарчыя камісіі

Выбарчыя камісіі для падрыхтоўкі і правядзення парламенцкіх выбараў утвараюцца ў адпаведнасці з палажэннямі раздзела 7 Выбарчага кодэксу і законам «Аб Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенню рэспубліканскіх рэферэндумаў». Сістэма камісій складаецца з ЦВК, 110 акруговых выбарчых камісій (АВК - па адной для кожнай аднамандатнай акругі) і 6659 участковых выбарчых камісій (УВК), 40 з якіх былі ўтвораныя ў дыпламатычных місіях Рэспублікі Беларусь для выбаршчыкаў, якія галасавалі за мяжой[4].

У склад ЦВК уваходзяць 12 членаў, прызначаемых на пяцігадовы тэрмін[5]. Дзеючы яе склад быў прызначаны ў студзені 2002 года. Старшыня камісіі і сакратар працуюць на сталай аснове, тады як большасць членаў прадстаўляюць сем адміністратыўных рэгіёнаў і часцяком з'яўляюцца супрацоўнікамі абласных падраздзяленняў Міністэрства юстыцыі[6]. 3 верасня Прэзідэнт выдаў дэкрэт, які дазваляў палітычным партыям, якія вылучылі сваіх кандыдатаў на парламенцкія выбары, вылучаць у склад ЦВК членаў з правам дарадчага голасу (без права ўдзелу ў галасаванні).

Паседжанні ЦВК з'яўляюцца адчыненымі, і на іх прысутнічаюць акрэдытаваныя журналісты і назіральнікі. Нягледзячы на тое, што члены з правам дарадчага голасу прымалі актыўны ўдзел у

[4] Для правядзення рэспубліканскага рэферэндуму ў кожнай адміністратыўнай адзінцы на паралельным узроўні былі ўтвораныя тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі (ТВК). УВК накіроўвалі пратаколы вынікаў рэферэндуму ў адпаведныя ТВК.

[5] Закон "Аб Цэнтральнай выбарчай камісіі" быў прыняты у красавіку 1998 года. Ім прадугледжваецца, што шэсць яе членаў прызначаюцца Прэзідэнтам і шэсць абіраюцца верхняй палатай Нацыянальнага сходу.

[6] Сямёра членаў камісіі маюць сталае месца працы ў рэгіёнах і выязджаюць у Мінск на яе паседжанні. Адна з членаў камісіі, спадарыня Кіселева, таксама прафесійна занятая правядзеннем выбараў, узначальваючы Арганізацыйна-прававы аддзел ЦВК. Адным з членаў ЦВК таксама з'яўляецца Намеснік Міністра юстыцыі – спадар Міцкевіч.

абмеркаваннях на ўсіх паседжаннях, прысвечаных разгляду скаргаў з нагоды адмовы ў рэгістрацыі/скасавання рэгістрацыі, іх пазіцыі не аказвалі ніякага ўплыву на рашэнні, якія прымаліся ў канкрэтных выпадках. За рэдкімі і неістотнымі выключэннямі рашэнні ЦВК прымаліся адзінагалосна. Члены камісіі, якія на сталай аснове працуюць у рэгіёнах, не ўдзельнічалі ў абмеркаваннях і ў асноўным захоўвалі маўчанне.

АВК І УВК з'яўляюцца часовымі органамі, прызначаемымі на кожныя выбары[7]. Артыкулам 35 Выбарчага кодэксу прадугледжваецца, што палітычныя партыі, іншыя грамадскія аб'яднанні, працоўныя калектывы, а таксама групы грамадзян могуць вылучаць па аднаму прадстаўніку ў адпаведную акруговую і ўчастковую камісію. Члены АВК прызначаюцца на сумеснай сесіі прэзідыумаў абласных і Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў. Члены УВК прызначаюцца раённымі і гарадскімі выканаўчымі камітэтамі. Адно з палажэнняў таксама дазваляе органам, прызначаючым камісіі, уключаць у склад гэтых камісій сваіх прадстаўнікоў. Тым не менш, абавязковых або рэкамендуемых нормаў прадстаўніцтва ў складзе камісій розных катэгорый вылучэнцаў не ўстаноўлена.

Такі парадак прызначэння складу камісій, у высокай ступені кантралюемы адміністрацыяй, прыводзіць да амаль поўнага выключэння ўдзелу партыйных вылучэнцаў у правядзенні выбараў. ЦВК паведамляла аб тым, што толькі 7 працэнтаў усяго колькаснага складу членаў АВК былі вылучаныя ад палітычных партый, улічваючы тыя з іх, якія падтрымлівалі ўрад[8]. Прадстаўніцтва партыйных вылучэнцаў у УВК было і зусім нікчэмна малым[9]. Большасць членаў УВК былі вылучаныя групамі грамадзян і працоўнымі калектывамі, звычайна з адной ўстановы або месца працы (школы або іншай арганізацыі/прадпрыемства) і часта знаходзіліся ў службовых зносінах вертыкальнага тыпу.

## B. Правядзенне выбараў

Адносна захавання тэрмінаў, прадугледжаных заканадаўствам, праца выбарчых камісій на ўсіх узроўнях была эфектыўнай. ЦВК вельмі загадзя, яшчэ ў маі, чэрвені і ліпені выдала інструкцыі і зацвердзіла формы дакументаў і матэрыялаў па выбарах, як таго патрабуе Выбарчы кодэкс[10]. Сярод іх стандартныя формы спісу выбаршчыкаў, бюлетэняў, пратаколаў, узоры пячатак, скрыняў для галасавання, розных пасведчанняў аб перадачы матэрыялаў і дакументаў па выбарах, а таксама формы дакументаў, якія датычацца рэгістрацыі кандыдатаў і захавання матэрыялаў і дакументацыі па выбарах. ЦВК таксама вызначыла межы аднамандатных акругаў і зацвердзіла дадатковыя правілы назірання за выбарамі ўнутранымі і замежнымі назіральнікамі. Усе інструкцыі і вытрымкі з заканадаўства былі выдадзены ў выглядзе асобных метадычных рэкамендацый для працы АВК і УВК і брашуры, якая змяшчала пералік зацверджаных афіцыйных формаў дакументаў і пасведчанняў. Інструкцыі па працэдурах у дзень выбараў былі ўключаныя ў метадычныя рэкамендацыі для працы УВК.

---

[7] Усе АВК складаліся з 13 членаў, тады як колькасць членаў УВК складала ад 5 да 19 у залежнасці ад колькасці выбаршчыкаў, зарэгістраваных на ўчастку (артыкул 34).
[8] Афіцыйная інфармацыя, размешчаная на інтэрнэт-сайце ЦВК.
[9] З прычыны таго, што партыі неаднаразова скардзіліся на тое, што прадстаўнікоў, якіх яны вылучалі ў склад УВК, ігнаравалі, МНВ БДІПЧ/АБСЕ паспрабавала правесці незалежную ацэнку структуры членства ў УВК па шляху вылучэння членаў у іх склад. У выбарцы з 404 УВК агульнай колькасцю 3388 членаў толькі 2 члена УІК былі названыя вылучэнцамі ад партый. У якасці крыніцы інфармацыі былі выкарыстаныя поўныя спісы членаў УВК, якія публікаваліся ў мясцовым друку. (Выбарка складаецца з наступных выбарчых акругаў - 16, 24, 30, 43, 61 (УВК №№ 46-86), 87, 91. На жаль, у большасці дадзеных выпадкаў у публікуемых спісах прызначаных членаў УВК не ўказваўся шлях вылучэння. Замест гэтага ўказваліся цяперашняе месца працы і пасада).
[10] Паўнамоцтвы ЦВК пералічаны ў артыкуле 33.

Тым не менш, праца выбарчых камісій характарызавалася адсутнасцю надзейнага і аднастайнага парадку з прычыны таго, што выбарчая адміністрацыя не прыняла мераў па шэрагу ключавых пытанняў, тады як іншыя рэгуляваліся найменш строгім чынам. Сярод прыкладаў таму наступныя:

- Адсутнасць усякага рэгулявання працэсу вырабу бюлетэняў. У метадычных рэкамендацях па працы АВК працэдуры вырабу бюлетэняў, забеспячэння імі і іх захоўвання змяшчаюцца ў чатырох сказах з прыкладам формы іх перадачы. Меры бяспекі не ўказаныя;

- Адсутнасць надзейных і строгіх крытэраў пасведчання асобы і апрацоўкі дадзеных па выбаршчыках. Ва ўсталяванай форме спісу выбаршчыкаў не прадугледжана ўказанне нумара дакумента, які пасвядчае асобу, прад'яўляемага выбаршчыкам членам УВК у дзень выбараў. Імя і адрас выбаршчыка прадстаўляюць сабой найменш строгія параметры пасведчання асобы, што выключае мажлівасць наступных праверак наконт неаднаразовага галасавання;

- Адсутнасць строгіх правілаў падліку галасоў. Прапаноўвалася спачатку праводзіць неафіцыйны падлік галасоў (па скрынях для датэрміновага галасавання / пераносных / стацыянарных скрынях, з занясеннем вынікаў у неафіцыйны журнал працы УВК), тады як у афіцыйную форму пратакола ўносіліся бы толькі агульныя лічбы;

- У форме пратакола не прадугледжана інфармацыя аб змяненнях, унесеных у спісы выбаршчыкаў пасля адкрыцця ўчасткаў для датэрміновага галасавання. Зыходзячы з яе, таксама немагчыма дакладна ўсталяваць адпаведнасць паміж колькасцю подпісаў у спісах выбаршчыкаў і колькасцю бюлетэняў, знойдзеных у скрынях[11];

- Адсутнасць асобных працэдураў для датэрміновага галасавання. Гэта выклікае пытанні як у сувязі з захаваннем ўжо адданых галасоў, так і ў сувязі з паслядоўнай перадачай дакументаў адзін адной дзесяццю рознымі зменамі, што неабходна для правядзення датэрміновага галасавання. Па заканчэнні дня выбараў члены УВК падпісваюць пратакол для пацвярджэння правільнасці ўсяго працэсу, нават нягледзячы на тое, што яны неабавязкова прысутнічаюць на працягу ўсяго перыяда галасавання;

- Неналежнае рэгуляванне парадку галасавання на тэрыторыі воінскіх частак, якое праяўляецца ў тым, што прама не ўсталяваны парадак галасавання вайскоўцаў асобна ў сваіх частках, а не разам з астатнімі грамадзянамі на звычайных участках для галасавання.

## C. Спісы выбаршчыкаў[12]

БДІПЧ/АБСЕ заклапочана тым, што працэдуры рэгістрацыі выбаршчыкаў і вядзення спісаў выбаршчыкаў і іх фармату бракуе элементарных мераў забеспячэння празрыстасці і гарантый ад неаднаразовай рэгістрацыі, неаднаразовага галасавання і персанацыі выбаршчыкаў.

Артыкулам 20 Выбарчага кодэксу прадугледжана, што выбаршчык можа быць унесены ў спіс выбаршчыкаў толькі на адным участку для галасавання, аднак у гэтым дачыненні выбарчыя камісіі

---

[11] Параўнанне з пратаколамі, якія выкарыстоўваліся ў аналагічных працэдурах у дзень выбараў у Расіі, выяўляе адсутнасць у беларускіх пратаколах наступных лічбаў: «колькасць згубленых выбарчых бюлетэняў», «колькасць не ўлічаных пры атрыманні выбарчых бюлетэняў», «колькасць выбаршчыкаў, якія прагаласавалі з выкарыстаннем пераносных скрыняў», «колькасць выбаршчыкаў, якія былі ўнесеныя ў спіс выбаршчыкаў у дзень выбараў».
[12] Спісы выбаршчыкаў разгледжаны ў артыкулах 19, 21, 38, і 44 Выбарчага кодэксу.

спадзяюцца выключна на эфектыўнасць працы мясцовай адміністрацыі і служб прапіскі. Адсутнасць цэнтралізаванага спісу выбаршчыкаў азначае, што не існуе магчымасці незалежнай ацэнкі дакладнасці працэсу рэгістрацыі выбаршчыкаў.

Спісы выбаршчыкаў складаюцца па кожнаму выбарчаму ўчастку, і не вядзецца агульнага або цэнтралізаванага спісу на ўзроўнях вышэй асобных участкаў. Неўзабаве пасля свайго прызначэння кожная УВК атрымоўвае ў мясцовай адміністрацыі першапачатковы спіс выбаршчыкаў на ўчастку. Спіс засноўваецца на дадзеных, паданых мясцовымі аддзеламі рэгістрацыі грамадзян Міністэрства ўнутраных спраў. Ім проста можа быць спіс выбаршчыкаў на ўчастку, які выкарыстоўваўся на апошніх выбарах.

Не пазней, чым за 15 дзён да дня выбараў УВК павінны правесці праверку і абнаўленне спісу. Абавязковага і аднастайнага спосабу такой праверкі не прадугледжана, аднак ЦВК рэкамендавала праверкі па месцы жыхарства выбаршчыкаў[13]. Пасля гэтага ўдакладнены спіс прадстаўляецца для ўсеагульнага азнаямлення ў памяшканні ўчастковай камісіі. У адпаведнасці з правіламі, усталяванымі ЦВК, выбаршчык можа правяраць наяўнасць у спісе толькі самога сябе і членаў сваёй сям'і, і запатрабаваць унясенне выпраўленняў, калі гэта неабходна. Прагляд дадзеных па іншых выбаршчыках прама забаронены, хоць назіральнікамі ММНВ і былі зафіксаваныя выпадкі, калі УВК выстаўлялі поўны спіс выбаршчыкаў на ўчастку на ўсеагульны агляд[14].

Выбаршчыкі, чые імёны адсутнічалі ў спісах, маглі дадаткова ўносіцца ў іх УВК да самага зачынення ўчасткаў для галасавання 17 кастрычніка пры ўмове, што выбаршчык мог прадставіць дапушчальны дакумент для пасведчання асобы і пацвярджэння свайго жыхарства на тэрыторыі выбарчага ўчастка. У дзень выбараў у спісы было дадаткова ўнесена амаль 74 000 выбаршчыкаў, якія прыйшлі на ўчасткі для галасавання.

Асаблівую заклапочанасць выклікала рашэнне ЦВК, прынятае толькі 12 кастрычніка (г.зн. ужо пасля пачатку датэрміновага галасавання), значна пашырыць спіс дакументаў, пасвядчаючых асобу, якія былі дапушчальнымі для пацвярджэння права на галасаванне. Замест таго, каб дазволіць выкарыстоўваць для гэтага толькі дзеючы беларускі пашпарт і два дакументы, дапушчальныя для яго замены[15], рашэннем ЦВК таксама дазвалялася прад'яўленне студэнцкага білету (у якім не ўказваецца грамадзянства, што дапускае магчымасць уключэння ў спісы выбаршчыкаў замежных грамадзян), пенсійных пасведчанняў і пашпартаў папярэдняга ўзору, якія не лічацца сапраўднымі ў іншых мэтах (пашпарты Рэспублікі Беларусь папярэдняга ўзору і савецкія пашпарты). Не было прадугледжана ўказанне ў спісе выбаршчыкаў насупраць імя выбаршчыка нумара і тыпу прад'яўленага ім для пасведчання асобы дакумента.

## VI. РЭГІСТРАЦЫЯ КАНДЫДАТАЎ

### A. Вылучэнне

Патэнцыйныя кандыдаты на парламенцкія выбары 17 кастрычніка 2004 года вылучаліся працоўнымі калектывамі колькасцю не меней за 300 чалавек, ад адной з 17 палітычных партый, зарэгістраваных

---

[13] «Арганізацыйна-прававыя пытанні працы ўчастковых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў», метадычныя рэкамендацыі ЦВК, ст. 17-18.

[14] Назіральнікі бачылі спісы выбаршчыкаў, выстаўленыя на поўны ўсеагульны агляд, на ўчастках выбарчай акругі № 67 (Гарэцкая, Магілёўская вобласць), акругі № 71 (Магілёўская-Ленінская) і акругі № 73 (Магілёўская-Кастрычніцкая).

[15] Вайсковы білет або часовае пасведчанне асобы, выдадзенае міліцыяй замест пашпарта, які знаходзіцца ў працэсе замены.

Міністэрствам юстыцыі, або шляхам самавылучэння. Для вылучэння свайго кандыдата ў выбарчай акрузе палітычным партыям было неабходна мець на тэрыторыі дадзенай акругі зарэгістраваную партыйную арганізацыйную структуру («першасную арганізацыю»). Палітычныя партыі і працоўныя калектывы вылучалі кандыдатаў на з'ездах і сходах адпаведна, тады як самавылучаўшымся кандыдатам было неабходна зарэгістраваць ініцыятыўныя групы колькасцю не меней за 10 чалавек, якім даручалася сабраць не меней за 1000 подпісаў выбаршчыкаў у акрузе.

Да наступлення крайняга тэрміну, 12 жніўня, прэтэндэнты на дэпутацкі мандат самастойнага вылучэння падалі 635 заяваў аб рэгістрацыі ініцыятыўных групаў у адпаведныя АВК. АВК зарэгістравалі 555 ініцыятыўных групаў і адмовілі ў рэгістрацыі 74 (што складае 12 працэнтаў); астатнія шэсць заяваў былі адазваныя. ЦВК скасавала шэсць рашэнняў АВК аб адмове ў рэгістрацыі ініцыятыўным групам. У якасці прычын адмовы ў рэгістрацыі АВК часцей за ўсё прыводзілі ўключэнне ў склад групаў непаўналетніх, асобаў, не з'яўляючыхся грамадзянамі Беларусі, або прымус да ўступлення ў групу[16]. Замест выключэння канкрэтных асобаў са складу групы, якая магла складацца з 20 і болей чалавек, АВК аддавалі перавагу на гэтай падставе не рэгістраваць цэлыя ініцыятыўныя групы. Гэты неканструктыўны падыход стаў першым у серыі адміністратыўных перашкодаў, з якімі сутыкнуліся патэнцыйныя кандыдаты.

Па стане на 6 верасня, дзень заканчэння этапу вылучэння кандыдатаў, налічвалася 692 прэтэндэнта на дэпутацкі мандат[17], у тым ліку 316 чалавек, вылучаных ад 11 палітычных партый. Партыі, звязаныя з праўрадавай Рэспубліканскай каардынацыйнай радай кіраўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў[18] вылучылі 29 кандыдатаў. Апазіцыйныя партыі, уваходзіўшыя ў склад двух нефармальных незарэгістраваных передвыбарчых блокаў[19], кааліцыі «Пяцерка плюс»[20] і кааліцыі дэмакратычных цэнтрыстаў[21] былі прадстаўленыя 232 прэтэндэнтамі (165 вылучэнцаў партый плюс суіскальнікі самастойнага вылучэння, якія мелі адпаведную партыйную прыналежнасць). Ліберальна-дэмакратычная партыя, з'яўляючыся сімпатызуючай уладзе асобнай палітычнай сілай і самай шматлікай партыяй у Беларусі, на сваім з'ездзе вылучыла 107 прэтэндэнтаў. На дэпутацкі мандат прэтэндавала сто васемнаццаць жанчын (17,1 працэнта ад агульнай колькасці суіскальнікаў), а таксама 66 парламентарыяў папярэдняга склікання.

[16] Ва многіх выпадках АВК адзначалі парушэнне "прынцыпа добраахвотнага ўдзелу" у працы ініцыятыўных групаў, спасылаючыся на артыкул 5 Выбарчага кодэксу, паводле якога выбаршчык асабіста вырашае, ці ўдзельнічаць яму ў выбарах.

[17] З прычыны таго, што Выбарчы кодэкс дазваляе патэнцыйным кандыдатам вылучацца ў некалькіх акругах і з дапамогай больш аднаго шляха вылучэння, але пры гэтым прадугледжваецца, што кандыдаты могуць быць зарэгістраваны толькі па адной выбарчай акрузе, фактычная колькасць заяваў, паданых 692 прэтэндэнтамі, склала 966. Некаторыя з патэнцыйных кандыдатаў вылучалі свае кандыдатуры неаднаразова для павышэння імавернасці рэгістрацыі, тады як іншыя прынялі рашэнне вылучацца ад палітычных партый або працоўных калектываў, першапачаткова планаваўшы збіраць подпісы, неабходныя для самавылучэння.

[18] Аграрная партыя, Беларуская сацыяльна-спартыўная партыя, Камуністычная партыя Беларусіі і Рэспубліканская партыя.

[19] У адпаведнасці з законам "Аб палітычных партыях", партыі маюць права ўтвараць передвыбарчыя блокі для вядзення передвыбарчай кампаніі, аднак такія блокі не могуць вылучаць кандыдатаў.

[20] З кааліцыяй "Пяцерка плюс" былі звязаныя Партыя камуністаў беларуская, Партыя БНФ, Партыя Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Аб'яднаная грамадзянская партыя і ліквідаваная Беларуская партыя працы.

[21] Кааліцыя дэмакратычных цэнтрыстаў уяўляла сабою пагадненне паміж парламенцкай групай "Рэспубліка", кааліцыяй "Маладая Беларусь" і Еўрапейскай кааліцыяй "Свабодная Беларусь", у якую ўваходзяць Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная Грамада) і Беларуская партыя жанчын "Надзея", аб супрацоўніцтве падчас выбараў.

## B. Рэгістрацыя

З 692 прэтэндэнтаў 359 (51,9 працэнта) былі зарэгістраваныя ў якасці кандыдатаў адпаведнымі АВК[22]. Сярод іх 151 кандыдат быў вылучаны ад палітычных партый; 137 кандыдатаў - ад працоўных калектываў; і 71 - шляхам самавылучэння. Дваццаць адзін прэтэндэнт адмовіўся ад удзелу ў выбарах да прыняцця АВК рашэння па пытанні аб рэгістрацыі. Увогуле, дадзеныя лічбы дакладна сведчаць на карысць таго, што патэнцыйным кандыдатам было значна лягчэй зарэгістравацца ў якасці вылучэнца ад працоўнага калектыву або палітычнай партыі, чым вылучаючыся самастойна. Тым не менш, сярод 312 прэтэндэнтаў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі, было няшмат менш за 200 прадстаўнікоў палітычных партый усяго палітычнага спектру (улічваючы афіцыйных вылучэнцаў і самастойна вылучаўшыхся прэтэндэнтаў, якія мелі партыйную прыналежнасць). Кандыдатамі ў дэпутаты былі зарэгістраваныя 79 жанчын і 57 дэпутатаў папярэдняга склікання.

Былі зарэгістраваныя восем з 29 кандыдатаў (27,6 працэнта), вылучаных Рэспубліканскай каардынацыйнай радай кіраўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў. У Камуністычнай партыі Беларусі (КПБ) былі зарэгістраваныя шэсць з яе 20 прэтэндэнтаў (30 працэнтаў); усе яны былі ў ліку 15 афіцыйных вылучэнцаў партыі. Рэгістрацыю прайшлі тры з сямі афіцыйных вылучэнцаў Рэспубліканскай партыі, тады як адзіны прэтэндэнт ад Беларускай сацыяльна-спартыўнай партыі зарэгістраваны не быў. Аграрная партыя афіцыйна не вылучала сваіх кандыдатаў.

З 232 прэтэндэнтаў, якімі былі прадстаўленыя кааліцыя «Пяцерка плюс» і кааліцыя дэмакратычных цэнтрыстаў, 122 былі зарэгістраваныя АВК (52,6 працэнта). У якасці кандыдатаў былі зарэгістраваныя лідары Партыі камуністаў беларускай, Партыі БНФ, Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Народная Грамада) і Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП). На рэгістрацыю прэтэндавалі пяць з шасці членаў парламенцкай групы «Рэспубліка», і двое з іх былі зарэгістраваныя АВК[23]. Восем самастойна вылучаўшыхся прэтэндэнтаў, звязаных з БНФ і партыяй «Народная Грамада», адмовіліся ад удзелу ў выбарах да прыняцця АВК рашэнняў па пытанні аб іх рэгістрацыі, заявіўшы аб ціску, які аказваўся на іх або іх ініцыятыўныя групы з боку працадаўцаў і/або мясцовых уладаў.

З 107 прэтэндэнтаў ад Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) у якасці кандыдатаў былі зарэгістраваныя 38 (35,5 працэнта).

Адна з неўплывовых палітычных сілаў, Кансерватыўна-хрысціянская партыя БНФ, вырашыла байкатаваць выбары і актыўна заклікала кандыдатаў і выбаршчыкаў далучыцца да яе ў дачыненні і выбараў, і рэферэндуму.

Рэгістрацыя кандыдатаў афіцыйна прайшла ў перыяд з 7 па 16 верасня. Тым не менш, з прычыны таго, што Выбарчым кодэксам прадугледжваецца магчымасць пачатку перадвыбарчай агітацыі кандыдатамі з моманту рэгістрацыі, Сакратар ЦВК 13 верасня заявіў аб тым, што ЦВК аддала АВК даручэнне поўнасцю завяршыць працэдуру рэгістрацыі 15-16 верасня. Улічваючы тое, што ў якасці прычыны была заяўлена патрэбнасць забеспячэння пачатку перадвыбарчай агітацыі зарэгістраванымі кандыдатамі прыкладна ў аднолькавы час, для дасягнення дадзенага выніку магчыма было ўсталяваць агульную дату старта перадвыбарчай агітацыі, замест таго, каб прывязваць яе пачатак да даты рэгістрацыі кожнага асобнага кандыдата.

---

[22] Для параўнання ў 2000 годзе было зарэгістравана 71.7 працэнта прэтэндэнтаў (551 з 769).
[23] Адзін з трох дэпутатаў групы "Рэспубліка", якім было адмоўлена ў рэгістрацыі АВК, Валерый Фралоў, паспяхова абскардзіў адпаведнае рашэнне ў ЦВК і ўдзельнічаў у выбарах.

Мелі месца тры асноўныя прычны адмовы АВК у рэгістрацыі: (i) указанне недакладных дадзеных у дэкларацыі аб даходах і маёмасці, якую павінен быў прадставіць кожны прэтэндэнт; (ii) у выпадку самавылучэння - падпісныя лісты кандыдата пільна правяраліся наконт наяўнасці недакладных дадзеных, і калі больш за 15% подпісаў выбаркі прызнаваліся несапраўднымі, не ўлічваліся ўсё лісты паводле Выбарчага кодэксу; і (iii) у выпадку вылучэнцаў ад палітычных партый – несапраўднасць юрыдычнага адрасу мясцовай партыйнай арганізацыйнай структуры («першаснай арганізацыі»). У некаторых выпадках было больш за адну прычыну адмовы ў рэгістрацыі прэтэндэнту. Прынамсі 10 прэтэндэнтаў, улічваючы Старшыню апазіцыйнай партыі Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада, Станіслава Шушкевіча, прызналі, што рашэнні АВК аб адмове ім у рэгістрацыі з'явіліся вынікам памылак, дапушчаных самімі прэтэндэнтамі або членамі іх ініцыятыўных групаў. МНВ БДІПЧ/АБСЕ здолела прааналізаваць рашэнні АВК аб адмове ў рэгістрацыі дзякуючы назіранню за слуханнямі скаргаў з нагоды адмовы ў рэгістрацыі ў ЦВК і Вярхоўным Судзе асноўным складам Місіі, а таксама назіранню групамі доўгатэрміновых назіральнікаў (ДСН) па ўсёй краіне.

Шэраг рашэнняў аб адмове ў рэгістрацыі ў сувязі з недакладнымі дэкларацыямі аб даходах і маёмасці былі прынятыя АВК на неістотных або фармалісцкіх падставах. Мелі месца выпадкі адмовы з-за незадэклараваных сум даходаў у вельмі маленькіх памерах (прынамсі ў чатырох выпадках такія сумы складалі меней за 10 долараў ЗША ў эквіваленце; у адным - пасляхова абскарджаным у ЦВК - сума складала меней за цэнт). Прынамсі некаторыя з праверак, праведзеных АВК, былі шырокамаштабнымі (напрыклад, у адным выпадку дакладнасць дэкларацыі прэтэндэнта аб даходах была пастаўлена пад сумненне на падставе зробленай высновы, што заяўленых сум дахода не было б дастаткова для аплаты рахункаў за мабільны тэлефон, атрыманых АВК у дзяржаўнай тэлефоннай кампаніі), і праходзілі з задзейнічаннем вельмі шырокага спектру іншых дзяржаўных органаў. Некаторыя прэтэндэнты, улічваючы двух парламентарыяў папярэдняга склікання, заявілі аб тым, што інфармацыя аб даходах, паданая ў АВК іх працадаўцамі, адрознівалася ад інфармацыі, паданай самім прэтэндэнтам, што прывяло да адмовы АВК у рэгістрацыі[24].

Рашэнні АВК аб рэгістрацыі вельмі невялікай часткі прэтэндэнтаў, вылучаных шляхам збору подпісаў, прадэманстравалі, што адпаведныя правілы па самай меншай меры з'яўляюцца залішне складанымі. Больш за тое, падставы для некаторых рашэнняў аб адмове сведчаць аб тым, што дадзеныя правілы ўжываліся непаслядоўна і нават адвольна. АВК павінны былі браць выбарку запісаў у падпісных лістах для пацвярджэння іх сапраўднасці. У адным з выпадкаў, прэтэндэнт Таццяна Швед падчас разгляду скаргі прадставіла доказы таго, што АВК №63 (Бабруйская-Ленінская акруга) не ўзяла належную выпадковую выбарку, а пільна праверыла ўсе 1488 паданых ёй подпісаў і адабрала асобныя лісты для фармавання выбаркі з дастатковай для адмовы ёй ў рэгістрацыі колькасцю несапраўдных подпісаў.

Сярод спосабаў праверкі АВК подпісаў напераменку выкарыстоўваліся графалагічная экспертыза і наведванні ўказаных у лістах асобаў з просьбай пацвердзіць сапраўднасць подпісаў і дат. Такія наведванні прывялі да прызнання несапраўднымі подпісаў у падтрымку шэрагу прэтэндэнтаў. У сувязі з дадзенай працэдурай паступалі паведамленні аб тым, што некаторыя з такіх наведванняў насілі запалохваючы характар, і непрызнанне подпісаў адбывалася пад ціскам альбо падманным шляхам. Падчас слухання ў Вярхоўным Судзе скаргі, паданай прэтэндэнтам Уладзімірам Ганчарыкам

[24] Сяргей Скрабец і Валерый Фралоў з групы "Рэспубліка", Уладзімір Чарвоненка з АГП у акрузе №50 (Ваўкавыская, Гродзенская вобласць) і Дзмітрый Шкулькоў з АГП у акрузе №47 (Рагачоўская, Гомельская вобласць) не былі зарэгістраваныя АВК на гэтай падставе, хоць Фралоў і Чарвоненка былі зарэгістраваныя па выніках слухання скаргаў у ЦВК.

(кандыдатам у прэзідэнты ад апазіцыі на выбарах 2001 года), намеснік старшыні АВК №109 (Уручская акруга, горад Мінск) прызнаў, што пільная праверка з выкарыстаннем графалагічнага аналізу выбарачна ўжывалася да подпісаў у падтрымку толькі асобных самавылучаўшыхся прэтэндэнтаў у дадзенай выбарчай акрузе.

Некаторым вылучэнцам палітычных партый было адмоўлена ў рэгістрацыі з прычыны адсутнасці ў дадзенай выбарчай акрузе першаснай арганізацыі (юрыдычнага адрасу падраздзялення іх палітычнай партыі) у адпаведнасці з патрабаваннямі артыкула 62 Выбарчага кодэксу. Выклікае заклапочанасць той факт, што прынамсі ў дзесяці выпадках такая адсутнасць стала вынікам зняцця мясцовых падраздзяленняў партый з уліку мясцовымі ўпраўленнямі Міністэрства юстыцыі 15 або 16 верасня (г.зн. у тыя самыя дні, калі АВК прымалі рашэнні па пытанні рэгістрацыі). Магчымасць тэрмінова абскардзіць дадзеныя рашэнні - да заканчэння перыяда рэгістрацыі - адсутнічала.

Надзвычай вялікая колькасць і сумнiўныя падставы для адмоваў у рэгістрацыі робяць магчымай здагадку, што свабода дзеянняў, якой валодалі АВК ва ўмовах існаваўшых прававых рамак, дапускала хутчэй абмежавальнае, чым ліберальнае тлумачэнне працэдуры рэгістрацыі кандыдатаў. Да некаторых кандыдатаў было асаблівае стаўленне, улічваючы актыўны пошук падставаў для адмовы ў рэгістрацыі.

## C. Скаргі, зняцце сваіх кандыдатур і скасаванне рэгістрацыі

ЦВК разгледзела 166 скаргаў ад патэнцыйных кандыдатаў, якім было адмоўлена ў рэгістрацыі АВК. У больш чвэрці выпадкаў ЦВК вынесла рашэнні на карысць апелянтаў, улічваючы 29 скаргаў, якія паступілі ад апазіцыйных кандыдатаў. З каля 120 адхіленых скаргаў 74 былі накіраваныя далей у Вярхоўны Суд, які задаволіў толькі дзве з іх. Слуханні ў ЦВК, а таксама ў Вярхоўным Судзе праводзіліся вельмі фармалісцкім чынам. Часцей за ўсё, рашэнні ніжэйшых інстанцый зацвярджаліся без прыняцця да ўвагі новых доказаў, прадстаўленных апелянтамі.

Пасля заканчэння рэгістрацыі больш за 50 кандыдатаў знялі свае кандыдатуры. Некаторыя кандыдаты знялі свае кандыдатуры ў падтрымку іншага кандыдата; гэта датычылася, у першую чаргу, кандыдатаў, вылучаных ад працоўных калектываў, якія здымалі кандыдатуры на карысць іншых праўрадавых кандыдатаў. Аднак мелі месца і некалькі выпадкаў зняцця сваіх кандыдатур адным апазіцыйным кандыдатам на карысць іншага. Істотная частка адмоваў працягваць перадвыбарчую гонку прыйшлася на кандыдатаў, спасылаўшыхся на «сямейныя абставіны, стан здароўя, і асабістыя прычыны» або зусім не абгрунтаваўшых свой учынак. БДІПЧ/АБСЕ не здолела праверыць паведамленні аб тым, што ў некаторых выпадках кандыдаты і іх прыхільнікі спынілі перадвыбарчую кампанію пад ціскам.

Напярэдадні дня галасавання АВК скасавалі рэгістрацыю прынмасі 20 кандыдатаў, улічваючы 10 рашэнняў аб адмене рэгістрацыі, прынятых ужо пасля пачатку датэрміновага галасавання 12 кастрычніка[25]. Скасаванне рэгістрацыі, часцей за ўсё, адбывалася ў выніку парушэнняў, звязаных з вядзеннем агітацыі, улічваючы некалькі выпадкаў, калі кандыдаты былі ананімным чынам абвінавачаныя і пасля знятыя з перадвыбарчай гонкі за такія неістотныя дзеянні, як распаўсюджванне газет або ўлетак нібыта зневажальнага характару ў адносінах да Прэзідэнта або іншых службовых асобаў. А ў выбарчай акрузе №2 (Брэсцкая-Цэнтральная) АВК скасавала рэгістрацыю кандыдата

[25] Андрэй Сумар і Дзмітрый Шыманскі (акруга №2, Брэсцкая-Цэнтральная), Марына Багдановіч (акруга №56, Лідская гарадская), Віктар Сівохін (акруга №82, Лагойская, Мінская вобласць), Аляксей Янукевіч (акруга №94, Аўтазаводская, горад Мінск), Іван Анташкевіч (акруга №103, Пушкінская, горад Мінск), Аляксандр Цынкевіч і Алег Волчак (акруга №105, Старавіленская, горад Мінск), Сусанна Фурса і Аляксей Міхалевіч (акруга №109, Уручская, горад Мінск).

Андрэя Сумара ў перыяд датэрміновага галасавання пасля выяўлення недакладнасцяў у яго дэкларацыі аб даходах, відавочна, працягнуўшы яе праверку нават пасля заканчэння перыяду рэгістрацыі[26]. Скасаванне рэгістрацыі на такім познім этапе фактычна пазбавіла выбарчага права тых грамадзян, хто прагаласаваў за кандыдатаў, якіх пасля пазбавілі рэгістрацыі. Акрамя таго, у выбарчай акрузе №97 (Купалаўская, горад Мінск) УВК выключылі імя кандыдата, пазбаўленага рэгістрацыі, з бюлетэняў падчас датэрміновага галасавання да разгляду адпаведнай скаргі, пазбавіўшы, такім чынам, выбаршчыкаў мажлівасці прагаласаваць за кандыдата, рэгістрацыя якога магла бы быць адноўленая.

У выніку, па стане на дзень выбараў усяго заставалася 330 кандыдатаў або ў сярэднім па тры на кожную выбарчую акругу. У 77 акругах балатавалася па тры кандыдаты і менш, улічваючы 10 выбарчых акругаў, у якіх выбары прайшлі безальтэрнатыўна, дзе ў бюлетэні быў унесены толькі адзін кандыдат. Такім чынам, нягледзячы на тое, што ЦВК і Вярхоўны Суд аказалі некаторае кампенсацыйнае ўздзеянне, зарэгістраваўшы шэраг кандыдатаў па выніках разгляду скаргаў, фармалісцкі і процідзейны падыход да рэгістрацыі кандыдатаў з боку АВК на працягу ўсяго дадзенага працэсу, пагоршаны вялікай колькасцю знятых кандыдатур, рэальна абмежаваў выбар выбаршчыкаў у дзень галасавання.

### D. “Супраць усіх”

У выбарчых акругах, дзе спаборнічалі па два і болей кандыдатаў, акрамя выбару паміж кандыдатамі ў бюлетэне выбаршчыкам таксама прадастаўлялася магчымасць прагаласаваць «супраць усіх».

Зыходзячы з таго, што сутнасць выбараў заключаецца ў прадстаўніцтве, варыянт «супраць усіх» цяжка суаднесці са стандартным азначэннем прадстаўнічай дэмакратыі: «супраць усіх» азначае, што выбаршчыкі могуць аддаць перавагу таму, каб іх наогул ніхто не прадстаўляў. Рашэнне не ўдзельнічаць у выбарах або апусціць у скрыню несапраўдны бюлетэнь павінна лічыцца дастатковым выразам выбаршчыкам сваёй незадаволенасці прапануемым выбарам кандыдатаў.

## VII. ПЕРАДВЫБАРЧАЯ АГІТАЦЫЯ

Толькі няшмат болей за палову ўсіх прэтэндэнтаў на рэгістрацыю ў якасці дэпутата можна было ідэнтыфікаваць як прадстаўнікоў палітычных партый (партыйных вылучэнцаў ці вылучаўшыхся самастойна, але з відавочнай партыйнай прыналежнасцю). З прычыны гэтага, роля партыйных платформаў у перадвыбарчай кампаніі была не вельмі прыкметнай. У пераважнай большасці акругаў падчас перадвыбарчай гонкі пытанням лакальнай важнасці, такім як даступнасць адукацыі і медыцынскага абслугоўвання або рост дзяржаўнага фінансавання дарожнага будаўніцтва надавалася невялікая ўвага. Абвяшчэнне рэспубліканскага рэферэндуму ў значнай меры адсунула на другі план кампанію па парламенцкіх выбарах. Кандыдаты ўсяго палітычнага спектру імкнуліся пакласці ў аснову сваёй кампаніі падтрымку або выступ супраць рэферэндуму, хоць гэтаеназіранне асабліва датычыцца прадстаўнікоў апазіцыі.

[26] Паведамляецца, што АВК накіравала запыт для атрымання інфармацыі ў Кіеў, на Украіну, дзе спадар Сумар валодаў кампаніяй. 12 кастрычніка яго рэгістрацыя была скасавана на падставе адказа, атрыманага з эканамічнага суда Кіева, дзе, па ўсёй бачнасці, паведамлялася, што дадзеная фірма была зачыненая. У выніку гэтага, АВК палічыла дэкларацыю аб маёмасці і даходах, прадстаўленую спадаром Сумарам, недакладнай.

У адпаведнасці з Выбарчым кодэксам кожнаму зарэгістраванаму кандыдату было выдзелена 975000 беларускіх рублёў (прыкладна 450 долараў ЗША) на выраб улетак і брашур. Тым не менш, з горада Мінска, Мінскай вобласці і Гомеля паступалі скаргі ад апазіцыйных кандыдатаў, звязаныя з адмовай дзяржаўных выдавецтваў і нежаданнем прыватных кампаній друкаваць агітацыйныя матэрыялы. Напрыклад, дзяржаўная тыпаграфія «Перамога» у Маладзечне (Мінская вобласць) адмовілася друкаваць агітацыйныя матэрыялы для аднаго з незалежных кандыдатаў, хоць, як паведамлялася, яна надрукавала матэрыялы для шэрагу іншых кандыдатаў. Кандыдаты таксама паведамлялі аб затрымках з атрыманнем агітацыйных матэрыялаў у выніку праверак, якія праводзіліся ў тыпаграфіях органамі міліцыі або падатковай інспекцыі[27]. У шэрагу выпадкаў падчас такіх праверак супрацоўнікі міліцыі канфіскоўвалі агітацыйныя матэрыялы. Матэрыялы пасля вярталіся, але толькі па працягу некалькіх дзён. Улічваючы абмежаваную колькасць часу, прадугледжанага для вядзення агітацыі кандыдатамі па заканадаўству, дадзеныя затрымкі прадстаўлялі сабою істотную перашкоду.

Асаблівую заклапочанасць выклікалі выпадкі аказання ціску на кандыдатаў, іх актывістаў або выбаршчыкаў і іх запалохванне. Прынамсі ў двух выпадках супрацоўнікі міліцыі правялі вобыскі перадвыбарчых штабоў кандыдатаў ад апазіцыйных партый. Падчас аднаго з такіх вобыскаў, праведзенага позна вечарам 1 кастрычніка ў адзіным для кандыдатаў ад АГП - Аляксандра Дабравольскага і Валянціны Палевіковай - перадвыбарчым штабе, назіральнікі МНВ БДІПЧ/АБСЕ сталі непасрэднымі сведкамі таго, як супрацоўнікі міліцыі РУУС Ленінскага раёна прад'явілі незаконным чынам складзены ордэр на канфіскацыю агітацыйнай літаратуры для спадара Дабравольскага, раней зацверджанай да выдання АВК №96 (Свіслацкая выбарчая акруга, горад Мінск)[28].

Назіральнікі БДІПЧ/АБСЕ паведамлялі аб затрыманні 10 кастрычніка ў Віцебску пры распаўсюджванні агітацыйных матэрыялаў кандыдата Ніны Кавалёвай, члена Партыі БНФ; затрымаўшы яе супрацоўнік міліцыі палічыў, што агітацыйныя матэрыялы, якія змяшчалі крытычны выраз у адрас Прэзідэнта Лукашэнкі, супярэчылі Выбарчаму кодэксу. 7 кастрычніка ў Брэсцкай вобласці (выбарчая акруга №7, Белавежская) на некалькі гадзін былі затрыманыя міліцыяй дванаццаць актывістаў партыі «Народная Грамада». Таксама 7 кастрычніка пры распаўсюджванні агітацыйнай літаратуры былі затрыманыя актывісты перадвыбарчай кампаніі кандыдата ад АГП Зінаіды Бандарэнкі (акруга №61, Смаргонская, Гродзенская вобласць); міліцыя канфіскавала дадзеныя матэрыялы на той падставе, што яны былі выраблены не ў тыпаграфіі, і налажыла на актывістаў адміністратыўныя штрафы. Прыхільнікі кандыдата ад БНФ Юрыя Хадыкі (выбарчая акруга №108, Каліноўская, горад Мінск) былі затрыманыя міліцыяй на дзве гадзіны пасля дазволенага агітацыйнага пікету 7 кастрычніка. Актывісты перадвыбарчай кампаніі незалежнага кандыдата Мікалая Козела (выбарчая акруга №80, Дзяржынская, Мінская вобласць) і кандыдата ад БНФ Уладзіміра Малея (акруга №13, Мухавецкая, Брэсцкая вобласць) падвяргаліся ціску і прыгнёту, як і сам кандыдат Козел.

Кандыдаты ў Брэсце, Любані, Мінску, Слуцку, Шчучыне і Ваўкавыску сутыкаліся з цяжкасцямі пры арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі, нягледзячы на тое, што паводле Выбарчага кодэксу мясцовыя

---

[27] Агітацыйныя ўлеткі, выраблены для Святланы Каралевай (акруга №94, Аўтазаводская, горад Мінск) тыпграфіяй "Топ Тайп", былі канфіскаваныя прадстаўнікамі Упраўлення па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі г. Мінска і вернуты толькі праз тры дні. Дадзенае рашэнне таксама паўплывала на трох іншых кандыдатаў (Аляксея Караля, Алега Волчака і Генадзя Ананьева). Некалькі кандыдатаў ад АГП (Анатоль Лябедзька, Яўген Лабановіч і Аляксандр Цынкевіч) звярнуліся ў ЦВК са скаргай пасля таго, як падатковыя органы і Упраўленне па барацьбе з эканамічнымі злачынствамі распачалі праверку тыпаграфіі "Арт-Прынт", дзе гэтыя кандыдаты імкнуліся надрукаваць агітацыйныя матэрыялы.

[28] Другі вобыск быў праведзены 13 кастрычніка супрацоўнікамі міліцыі Фрунзенскага РУУС у перадвыбарчым штабе яшчэ аднаго кандыдата ад АГП у Мінску, Івана Анташкевіча.

ўлады павінны аказваць ім у гэтым садзейнічанне[29]. АВК вынеслі кандыдатам як мінімум 25 папярэджанняў у сувязі з парушэннямі парадку вядзення агітацыі, што прадстаўляецца вынікам аб'яднання намаганняў для таго, каб перашкаджаць кандыдатам у працы з выбаршчыкамі. Мелі месца прынамсі 16 выпадкаў скасавання рэгістрацыі кандыдатаў на падставе сумніўных парушэнняў палажэнняў Выбарчага кодэксу аб парадку вядзення агітацыі. Пры гэтым, прынамсі ў адным выпадку, непасрэднымі сведкамі якога сталі назіральнікі МНВ БДІПЧ/АБСЕ, грубае і неаднаразовае парушэнне парадку вядзення агітацыі праўрадавым кандыдатам у выбарчай акрузе №105 (Старавіленская, горад Мінск), якое заключалася ў вывешванні плакатаў ва не ўсталяваных для гэтага месцах, засталося бескараным з боку АВК. У другім выпадку, кандыдат у акрузе №110 (Партызанская, горад Мінск) не меў дазволу АВК або ЦВК на распаўсюджванне 20000 экзэмпляраў газеты, якая змяшчала агітацыйныя ўлеткі, хоць член ЦВК з правам дарадчага голасу ад партыі «Народная Грамада» і звяртаў на гэта ўвагу ЦВК. У абодвух выпадках дадзеныя кандыдаты ў выніку перамаглі на выбарах.

Шэраг кандыдатаў адзначалі, што месцы, усталяваныя мясцовымі ўладамі для правядзення агітацыйных мерапрыемстваў, не дазвалялі ім звярнуцца да значнай часткі электарата ў выбарчай акрузе ў сувязі з абмежаванай колькасцю такіх месцаў або іх месцазнаходжаннем. Напрыклад, у Мінску гарадскі выканаўчы камітэт усталяваў для правядзення агітацыйных мерапрыемстваў і размяшчэння агітацыйных матэрыялаў 122 месцы. У выніку, у адной з выбарчых акругаў (№106, Коласаўская) было толькі чатыры ўсталяваныя месцы[30]. Паведамлялася аб многіх выпадках адмовы ў просьбах аб прадастаўленні дадатковых месцаў для правядзення сустрэч. У той жа час ва многіх выбарчых акругах АВК аказвалі істотную падтрымку ў арганізацыі «форумаў з кандыдатамі», падчас якіх выбаршчыкі маглі азнаёміцца з перадвыбарчымі праграмамі кандыдатаў.

Абмежаванні маагчымасцяў вядзення агітацыі кандыдатамі былі асабліва заўважальнымі ў святле масавай агульнанацыянальнай і, па ўсёй бачнасці, фінансуемай дзяржавай кампаніі ў падтрымку пытання, вынесенага на рэферэндум. Кампанія ў падтрымку рэспубліканскага рэферэндуму стварыла атмасферу, у якой апазіцыі адводзілася роля палітычнай сілы, якая выступае супраць інтарэсаў дзяржавы. Напрыклад, падчас кампаніі ў падтрымку галасавання «за» на рэферэндуме прыкладаліся сур'ёзныя намаганні для таго, каб прыраўняць галасаванне «супраць» на рэферэндуме, а, па аналогіі, і ў падтрымку кандыдата, які выступаў супраць рэферэндуму, да галасавання супраць будучыні самой Беларусі.

Прэзідэнт Лукашэнка выступіў з шэрагам публічных заяваў адносна выбараў. Прэзідэнт неаднаразова публічна заяўляў аб пажаданасці абмежавацца адным турам выбараў для эканоміі дзяржаўных сродкаў, якія б запатрабаваліся для правядзення другога тура. 6 кастрычніка ён паўтарыў, што кандыдаты ад улады павінны заняць усе 110 месцаў у Палаце прадстаўнікоў па выніках ужо першага тура выбараў, заявіўшы аб тым, што «у нас досыць улады і тэхналогій, каб зруйнавальна выйграць гэтыя выбары»[31].

---

[29] Паводле артыкула 45 Выбарчага кодэксу, мясцовыя ўлады павінны ствараць умовы для правядзення сустрэч паміж кандыдатамі і электаратам, а дзяржаўныя органы бясплатна прадастаўляць памяшканні для такіх сустрэч з выбаршчыкамі.

[30] Сярэдняя колькасць выбаршчыкаў у акрузе складала 64585 з адхіленнямі не больш за 10 працэнтаў.

[31] Раней, на прэс-канферэнцыі, якая адбылася 20 ліпеня 2004 года, Прэзідэнт Лукашэнка заявіў, што аддаў "даручэнне" аб тым, каб 30 працэнтаў дзеючых парламентарыяў былі пераабраны, а прадстаўніцтва жанчын у Парламенце было павялічана да 30-40 працэнтаў яго складу.

## VIII. СРОДКІ МАСАВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

### A. Агульныя звесткі аб СМІ ў Рэспубліцы Беларусь

Усе агульнанацыянальныя электронныя СМІ Беларусі, а менавіта тэлеканалы БТ1 (Першы нацыянальны тэлеканал), АНТ (Агульнанацыянальнае тэлебачанне) і радыёстанцыя БР1 (Першы канал беларускага нацыянальнага радыё), кантралююцца дзяржавай. Гэтак жа падкантрольнымі з'яўляюцца два іншых канала тэлебачання з шырокай зонай вяшчання на тэрыторыі Беларусі - тэлеканал «Лад» і СТБ (апошні прымаецца ў Мінску, у абласных цэнтрах і некаторых іншых раёнах). У Беларусі транслююцца тэлеканалы Расійскай Федэрацыі НТВ і РТР, але яны не надаюць значнай увагі асвятленню палітычных падзей у Беларусі, і наогул адбываецца скарачэнне гледачовай аўдыторыі транслюючыхся ў Беларусі расійскіх тэлеканалаў. Мясцовыя тэлеканалы і ФМ-радыёстанцыі не выступаюць у якасці важнай крыніцы палітычнай інфармацыі з прычыны абмежаванасці асвятлення палітычнай тэматыкі.

Альтэрнатыўную інфармацыю палітычнага характару можна атрымаць у асноўным з недзяржаўных друкаваных выданняў і ў сетцы «Інтэрнэт». Тым не менш, на беларускім газетным рынку назіраецца сітуацыя, падобная на становішча справаў у тэлерадыёвяшчанні, у якой дамінуе дзяржаўны друк. Недзяржаўныя СМІ скардзяцца на перашкоды, ствараемыя дзяржавай, якія прыводзяць да зніжэння ўплывовасці недзяржаўных СМІ, напрыклад, адмову прадастаўляць інфармацыю журналістам недзяржаўных выданняў, увод абмежаванняў на друк і распаўсюджванне газет і накладанне фінансавых абмежаванняў.

На працягу двух месяцаў, якія папярэднічалі выбарам 17 кастрычніка 2004 года, быў прыпынены выхад каля дзесятка друкаваных выданняў. Дзейнасць большасці з гэтых газет была прыпынена Міністэрствам інфармацыі на абмежаваны перыяд часу (звычайна на тры месяцы) з-за парушэнняў фармальных патрабаванняў, якія тычацца рэгістрацыйнага статусу газеты (напрыклад, калі газета не паведамляла аб змяненні яе юрыдычнага адрасу, не паведамляла аб змяненні перыядычнасці выпуску, не паведамляла аб змяненні зместу або фармата або не адпраўляла абавязковы экзэмпляр для бібліятэчнай падшыўкі). Міністэрства інфармацыі заяўляла аб тым, што прыпыненне дзейнасці выданняў не было звязана з выбарамі, аднак гэта аспрэчвалася прадстаўнікамі многіх дадзеных газет.

### B. Парадак выкарыстання СМІ

Калі асноўная прававая база ўдзелу СМІ ў выбарчай кампаніі вызначалася Выбарчым кодэксам[32], то непасрэдныя правілы выкарыстання кандыдатамі дзяржаўных СМІ падчас парламенцкіх выбараў 2004 года былі ўсталяваныя Пастановай ЦВК №71, прынятай 8 верасня[33]. Зыходзячы з прынцыпа роўнага доступу да дзяржаўных СМІ, кожны кандыдат меў права апублікаваць сваю перадвыбарчую праграму аб'ёмам у дзве машынапісныя старонкі ў фінансуемых з дзяржаўнага бюджэту агульнарэспубліканскіх газетах або мясцовым друку, і кожны кандыдат меў права на адзін выступ па тэлебачанні і адзін па радыёвяшчанні, ідучыя ў запісу і маючыя даўжыню не больш за пяць хвілін. Большасць кандыдатаў вырашылі поўнасцю скарыстацца дадзенымі правамі.

---

[32] Артыкулы 45, 46, 47, 49 і 74.
[33] Пастанова была прынята ў адпаведнасці з артыкулам 33 Выбарчага кодэксу.

Выступы кандыдатаў трансляваліся на тэлеканалах «Лад» і БТ1 і на першым канале нацыянальнага радыё і радыёстанцыі «Сталіца» з 20 верасня па 11 кастрычніка[34] (паміж 18:00 і 19:00 па тэлебачанні, і паміж 17:00 і 18:00 па радыё). Выступы кандыдатаў з рэгіёнаў запісваліся і трансляваліся адной з пяці абласных студый дзяржаўнага тэлебачання і радыёвяшчання. Чарговасць прадстаўлення выбарчых акругаў была вызначаная ЦВК; чарговасць выступу кожнага кандыдата ў акрузе вызначалася жэрабям, якое праводзілася адпаведнай АВК. Некаторыя кандыдаты скардзіліся на тое, што выбаршчыкаў пазбаўлялі доступу да інфармацыі, бо бясплатныя выступы трансляваліся па тэлебачанні ў нязручны для гледачоў час і далёка не ў прайм-тайм. Паведамляць выбаршчыкам аб часу трансляцыі сваіх бясплатных выступаў даводзілася самім кандыдатам, бо СМІ не распаўсюджвалі дадзеную інфармацыю.

Ні ў электронных, ні ў друкаваных сродках масавай інфармацыі не размяшчаліся платныя агітацыйныя матэрыялы кандыдатаў, а па электронным СМІ не трансляваліся дэбаты паміж саpернікамі. Такім чынам, бясплатныя пяціхвілінныя выступы былі адзінай магчымасцю для кандыдатаў данесці свае погляды да выбаршчыкаў праз СМІ, аднак іх працягласць не дазваляла кандыдатам падрабязна расказаць аб сваіх праграмах.

Мелі месца выпадкі, калі выступы кандыдатаў падвяргаліся цэнзуры, а трансляцыя аднаго выступу наогул была забароненая. У Гомельскай вобласці тэлевыступ Яўгена Фурсеева (акруга №33, Гомельская-Юбілейная) быў запісаны 20 верасня, але пры трансляцыі на мясцовай студыі тэлеканала «Лад» яго змест быў зменены з ужываннем цэнзуры да выказанай кандыдатам пазіцыі па рэспубліканскім рэферэндуме. Скарга спадара Фурсеева ў мясцовую пракуратуру была задаволеная, і яго выступ выйшаў у эфір у першапачаткова запісаным выглядзе. Гомельская абласная студыя тэлеканала «Лад» таксама прад'явіла прэтэнзіі да зместу тэлевыступу Таццяны Марчанкі (акруга №36, Гомельская-Савецкая) на падставе парушэння ім палажэнняў Выбарчага кодэксу і адмовілася яго трансляваць. Скаргі спадарыні Марчанкі ў ЦВК і пракуратуру былі адхіленыя, аднак ЦВК парэкамендавала кандыдату змяніць змест свайго выступу, і пасля таго, як яна выканала рэкамендацыю, выступ 4 кастрычніка выйшаў у эфір. Тэлевыступ Мікалая Ворана (выбарчая акруга №51, Гарадзенская-Занёманская) наогул не выйшаў ў эфір на тэлеканале «Лад» у Гродне, з прычыны таго, што дырэктар студыі меў пярэчанні адносна яго зместу (заявіўшы аб яго неадпаведнасці Выбарчаму кодэксу), а кандыдат адмовіўся ўносіць змяненні. МНВ БДІПЧ/АБСЕ таксама атрымоўвала паведамленні аб самацэнзуры, якая ўжывалася кандыдатамі для папярэджання любых магчымых парушэнняў палажэння Выбарчага кодэксу, якое прадугледжвае санкцыі за абразу або паклёп на службовых асобаў[35].

17 жніўня 2004 года[36] ЦВК заснавала Назіральную раду ў складзе сямі членаў - прадстаўнікоў выключна падкантрольных дзяржаве ўстаноў, улічваючы дзяржаўныя электронныя і друкаваныя СМІ, для садзейнічання ЦВК у разглядзе скаргаў, якія адносяцца да сродкаў масавай інфармацыі. Назіральная рада разгледзела і дала свае заключэнні ў чатырох выпадках, накіраваных ёй з ЦВК. Імі былі вышэйзгаданы выпадак з кандыдатам Яўгенам Фурсеевым; два выпадку прызнання адпаведнымі АВК зместу бясплатных радыёвыступленняў неадпавядаючым Выбарчаму кодэксу, за што кандыдаты пасля былі пазбаўленыя рэгістрацыі; і адна скарга дзяржаўнай газеты «Рэспубліка», якая прад'явіла прэтэнзіі да зместа агітацыйных матэрыялаў, якія шэраг кандыдатаў імкнуліся апублікаваць, карыстаючыся сваім правам на бясплатную газетную плошчу.

[34] Як мінімум адзін выступ трансляваўся пасля 11 кастрычніка з-за тэхнічнай накладкі, якая адбылася пры яго першапачатковай трансляцыі.
[35] Артыкул 47 Выбарчага кодэксу.
[36] Пастанова ЦВК №39 ад 17 жніўня 2004 года.

## C. Маніторынг СМІ

Пачынаючы з 6 верасня БДІПЧ/АБСЕ праводзіла якасны і колькасны аналіз праграм, якія выходзілі ў прайм-тайм (з 18:00 да 24:00) на чатырох тэлеканалах - дзяржаўных БТ1, АНТ і СТБ і канале Расійскай Федэрацыі РТР - і ранішніх праграм навін на дзяржаўным канале радыёвяшчання БР1. Акрамя таго, ладзіўся маніторынг трох дзяржаўных газет - «Савецкая Беларусія», «Звязда» і «Народная газета» і трох недзяржаўных газет - «Народная воля», «Беларуская газета» і «Камсамольская праўда ў Беларусіі».

За выключэннем прыкладна двух тыдняў, якія непасрэдна папярэднічалі дню выбараў, дзяржаўныя электронныя сродкі масавай інфармацыі ў навінах і праграмах, прысвечаных бягучым падзеям, паведамлялі толькі невялікі аб'ем інфармацыі, звязанай з парламенцкімі выбарамі; а калі такая інфармацыя паведамлялася, яна амаль поўнасцю датычылася дзейнасці ЦВК. Акрамя бясплатных выступаў (гл. вышэй) кандыдаты не мелі прамога доступу да электронных СМІ за выключэннем некаторых балатаваўшыхся для пераабрання членаў Палаты прадстаўнікоў папярэдняга склікання, якія фігуравалі ў іх у якасці займаючых свае афіцыйныя пасады. Электронныя СМІ паведамлялі вельмі абмежаваны аб'ем інфармацыі аб дзейнасці разнастайных партый.

На працягу ўсяго перыяду маніторынгу ўсе электронныя СМІ, якія з'яўляліся яго аб'ектам, надавалі асноўную ўвагу дзейнасці Прэзідэнта. У навінах усіх беларускіх электронных СМІ, маніторынг якіх праводзіўся, Прэзідэнту і ўраду было нададзена больш за 90 працэнтаў агульнага эфірнага часу. З усяго эфірнага часу, адведзенага прадстаўленню палітычных дзеячаў і дзеючых асобаў выбараў, у навінах на канале БТ1 на Прэзідэнта Лукашэнка прыйшлося 82 працэнта, на АНТ - 79 працэнтаў і на СТБ - 74 працэнта часу. Ва ўсіх беларускіх электронных СМІ, якія з'яўляліся аб'ектам маніторынгу, у пераважнай большасці выпадкаў Прэзідэнт характарызаваўся са станоўчага боку. На працягу двух тыдняў, якія папярэднічалі выбарам, эфірны час, прысвячаўшыся Прэзідэнту ў дзяржаўных СМІ, павялічыўся. На фоне будучага рэспубліканскага рэферэндуму асвятленне дзейнасці Прэзідэнта ў СМІ было падобна на палітычную кампанію, калі ў навінах і праграмах, прысвечаных бягучым падзеям, штодзённа выходзілі рэпартажы аб поспехах эканомікі пры спадары Лукашэнка ва ўладзе.

Дзяржаўныя СМІ прадэманстравалі яўную прадузятасць у прадстаўленні імі палітычных альтэрнатываў. Увогуле, назіралася адсутнасць сапраўдных дэбатаў аб палітычных падзеях і несбалансаванасць у прадстаўленні палітычных пазіцый. Агульны эфірны час, адведзены канкрэтным палітычным партыям, быў меншым, чым колькасць часу, нададзенага абстрактна азначанай «апазіцыі». Яе прадстаўлялі ў асноўным ускосным чынам, асабліва ў аналітычных праграмах і спецыяльных праектах на тэлеканалах, маніторынг якіх праводзіўся: іх танальнасць была надзвычай негатыўнай, а часам і зневажальнай. Некаторыя дзеячы апазіцыі былі прадстаўлены ворагамі дзяржавы, абвінавачаныя ў некампетэнтнасці, радыкальным нацыяналізме або крымінальных дзеяннях. Асаблівую ўвагу прыцягнуў цыкл праграм пад назвай «Канспіралогія», якія дэманстраваліся на каналах БТ1 і СТБ. У серыі, якая выйшла ў эфір 18 верасня, Станіслава Шушкевіча, лідара партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада», абвінавацілі ў злачынствах супраць дзяржавы і сімпатыях тэрарызму. Валерый Фралоў з парламенцкай групы «Рэспубліка» характарызаваўся ў вельмі негатыўных танах у некалькіх выпусках дадзенай праграмы, асабліва 29 верасня, калі яго ў ліку іншых абвінавацілі ў дзеяннях у падтрымку тэрарызму.

10 верасня ў Беларусі на частаце канала РТР была паказаная 25-хвілінная праграма, у якой з адмоўнага боку былі ахарактарызаваныя некаторыя беларускія няўрадавыя арганізацыі, а таксама розныя міжнародныя і спонсарскія арганізацыі, нібыта іх падтрымліваючыя. Гэтая праграма была

ўстаўлена ў сетку вяшчання каналам СТБ, рэтранслюючым РТР у Беларусі, замест таго, што ў гэты час транслявалася каналам РТР у Расіі, пры гэтым на экране заставаўся лагатып РТР, што магло стварыць няправільнае ўражанне. Прадстаўнік СТБ пасля патлумачыў гэта тэхнічнай накладкай.

Друкаваныя выданні прадстаўлялі больш разнастайную інфармацыю аб розных палітычных альтэрнатывах у параўнанні з электроннымі СМІ. Усе друкаваныя СМІ, якія былі аб'ектам маніторынгу, надавалі больш за ўсё газетнай плошчы Прэзідэнту. Што тычыцца газеты з самым вялікім тыражом, «Савецкай Беларусіі», на працягу перыяда маніторынгу на Прэзідэнта прыйшлося 89 працэнтаў газетнай плошчы, адведзенай палітычным дзеячам і дзеючым асобам выбараў[37]. Дзве іншыя з назіраўшыхся газет, «Звязда» і «Народная газета», надалі Прэзідэнту дзве трэці адпаведнай газетнай плошчы. Ва ўсіх трох дзяржаўных газетах, маніторынг якіх праводзіўся, Прэзідэнт характарызаваўся ў пераважнай большасці выпадкаў са станоўчага боку. Тры недзяржаўных друкаваных выданні, якія з'яўляліся аб'ектам маніторынгу, характарызавалі яго з адмоўнага боку. «Народная воля» і «Камсамольская праўда ў Беларусіі» прысвяцілі значны аб'ем газетнай плошчы парламенцкай групе «Рэспубліка»[38]. У іх парламенцкая група і іншыя апазіцыйныя палітычныя партыі і блокі характарызаваліся альбо нейтральным чынам, альбо са станоўчага боку.

Назіралася значная дыспрапорцыя ў колькасці часу, адведзенага ў СМІ асвятленню рэспубліканскага рэферэндуму ў параўнанні з парламенцкімі выбарамі. Напрыклад, адукацыйныя ролікі для выбаршчыкаў аб парламенцкіх выбарах трансляваліся толькі па аднаму з каналаў, якія з'яўляліся аб'ектам маніторынгу, БТ1, а агульны эфірны час дадзеных ролікаў за перыяд маніторынгу склаў меней за 16 хвілін. У параўнанні з гэтым ролікі, інфармаваўшыя гледачоў аб тым, як запаўняць бюлетэні па рэферэндуме, якія тлумачылі, як зрабіць адзнаку ў графе «За», аднак не ўзгадвалі пра магчымасць прагаласаваць «Супраць», трансляваліся па ўсіх тэлеканалах, маніторынг якіх праводзіўся; агульны эфірны час, адведзены для трансляцыі дадзеных ролікаў за перыяд маніторынгу быў амаль у пяць разоў большым (75 хвілінаў). Акрамя гэтага, 8 верасня, адзін дзень пасля прызначэння Прэзідэнтам рэспубліканскага рэферэндуму, канал «АНТ» пачаў трансляцыю серыі ролікаў пад лозунгам «За моцную і квітнеючую Беларусь» у падтрымку Прэзідэнта і ўдзелу грамадзян у рэферэндуме. Дадзеныя ролікі выходзілі ў эфір АНТ на працягу пяці дзён.

30 верасня суд горада Гродна аштрафаваў Алену Раўбецкую, галоўнага рэдактара гродзенскай газеты «Біржа інфармацыі» на суму ў памеры 1,2 мільёна беларускіх рублёў (прыкладна 600 долараў ЗША) за распаўсюджванне ілжывай інфармацыі, якая абражае гонар і годнасць Прэзідэнта ў сродках масавай інфармацыі. Яе віна заключалася ва ўключэнні ў артыкул, апублікаваны 9 верасня, наступнай фразы: «Рэферэндум (а без яго трэцяга тэрміну не атрымаць), абвешчаны спадаром прэзідэнтам - гэта выклік грамадству... Трэба валодаць не толькі адсутнасцю сораму, але і «панскай» знявагай да плебсу…».

БДІПЧ/АБСЕ само падвяргалася беспрэцэдэнтным слоўным нападкам і публічным абвінавачванням з боку высокапастаўленых дзяржаўных чыноўнікаў і дзяржаўных СМІ: безгрунтоўна абвінавачвалася ў прадузятасці і загатаваных загадзя заключэннях аб выбарах. У эфіры дзяржаўнага тэлеканала БТ неаднаразова гучала ілжывая інфармацыя аб БДІПЧ/АБСЕ і яго дзейнасці ў Беларусі. Інсінуацыі і адсутнасць любых спробаў атрымаць інфармацыю напрамую ад прадстаўнікоў МНВ рабілі магчымай здагадку аб наўмыснай дыскрэдытацыі МНВ БДІПЧ/АБСЕ.

---

[37] Гэтая вельмі высокая лічба часткова тлумачыцца спецыяльным нумарам газеты, выданым 14 кастрычніка, які бясплатна распаўсюдзілі па паштовых скрынках і які быў амаль поўнасцю прысвечаны Прэзідэнту Лукашэнка.
[38] "Народная воля" - 20,5 працэнта; "Камсамольская праўда ў Беларусіі" - 6,3 працэнта.

## IX. УДЗЕЛ ЖАНЧЫН[39]

У Палаце прадстаўнікоў папярэдняга склікання было 14 дэпутатаў-жанчын (12,7 працэнта). Сто васемнаццаць жанчын прэтэндавалі на рэгістрацыю ў якасці кандыдатаў, з іх 83 былі зарэгістраваныя, улічваючы рэгістрацыю чатырох з іх па выніках разгляда скаргаў у ЦВК. У выніку зняцця сваіх кандыдатур і скасавання рэгістрацыі чатырох кандыдатаў-жанчын, 17 кастрычніка на дэпутацкі мандат прэтэндавалі 70 жанчын (21,2 працэнта ад агульнай колькасці кандыдатаў-330). Жанчыны атрымалі няшмат меней за 30 працэнтаў месцаў у Палаце прадстаўнікоў, што больш чым ў два разы павялічыла іх прадстаўніцтва ў Парламенце ў параўнанні з папярэднім скліканнем.

Адметна, што Беларуская партыя жанчын «Надзея» прыняла рашэнне не вылучаць сваіх кандыдатаў на выбары.

Жанчыны былі істотным чынам прадстаўленыя ў складзе выбарчых камісій. Старшынёй ЦВК з'яўляецца жанчына.

## X. ПЫТАННІ, ЗВЯЗАНЫЯ З УДЗЕЛАМ МЕНШАСЦЯЎ У ВЫБАРЧЫМ ПРАЦЭСЕ

Паводле вынікаў перапісу на тэрыторыі Беларусі ў цяперашні час пражывае больш за 130 нацыянальнасцяў. 81,2 працэнта насельніцтва складаюць беларусы, а трыма самымі вялікімі групамі нацыянальных меншасцяў з'яўляюцца рускія (11,4 працэнта насельніцтва), палякі (3,9 працэнта) і ўкраінцы (2,4 працэнта). У Мінскай, Гомельскай і Віцебскай абласцях пражываюць абшчыны рома. Нягледзячы на тое, што два кандыдаты польскага паходжання не былі зарэгістраваныя, у тым ліку і пасля разгляду ЦВК і Вярхоўным Судом адпаведных скаргаў, прычыны гэтага не прадстаўляюцца маючымі дачыненне да іх нацыянальнага паходжання.

Наогул, праблемы, звязаныя з прыналежнасцю да нацыянальных меншасцяў, падчас выбарчага працэсу не адзначаліся.

## XI. УНУТРАНЫЯ НАЗІРАЛЬНІКІ

Пастанова ЦВК ад 15 ліпеня 2004 уносіць растлумачэнні ў палажэнні Выбарчага кодэксу аб правах і абавязках унутраных назіральнікаў. Унутранымі назіральнікамі можа стаць шырокае кола асобаў. Назіранне за працай асобных УВК і АВК дазваляецца весці на падставе акрэдытацыі, атрыманай у дадзеных органах.

Асобы, якія прадставіліся ўнутранымі назіральнікамі, прысутнічалі на больш двух трэцяў наведаных ММНВ выбарчых участкаў падчас галасавання ў дзень выбараў, і на 94 працэнтах выбарчых участкаў, дзе назіральнікі ММНВ сачылі за падлікам галасоў. Многія ўнутраныя назіральнікі прадстаўлялі

[39] Гендэрная палітыка АБСЕ заснавана на прынцыпах, вызначаных Капенгагенскім дакументам (1990 года), у якім выкладзеныя асноўныя палажэнні аб барацьбе з дыскрымінацыяй і абавязальніцтвы ў сферы палітычных правоў і вяршэнства закона. Асноўныя стандарты АБСЕ па гендэрнай роўнасці ўключаны ў Маскоўскі дакумент (1991 года) і Хартыю еўрапейскай бяспекі (1999 года), якія абавязваюць дзяржавы-ўдзельніцы садзейнічаць раўнапраўю паміж мужчынамі і жанчынамі.

грамадскія арганізацыі, цесна звязаныя з дзяржавай, такія як супольнасць ветэранаў, фінансуемыя дзяржавай маладзежныя арганізацыі і прафесійныя саюзы. Назіральнікі ад АБСЕ звярнулі ўвагу, што на значнай частцы выбарчых участкаў, дзе яны сустракалі асобаў, якія прадстаўляліся ўнутранымі назіральнікамі, дадзеныя асобы паводзілі сябе пасіўна (напрыклад, не рабілі ніякіх нататкаў і не вялі запісаў аб сваім назіранні). У іншых выпадках праца ўнутраных назіральнікаў была расцэнена назіральнікамі ад АБСЕ як дадатковы сродак кантролю з боку дзяржавы: на выбарчым участку №35 у акрузе №58 (Мастоўская, Гродзенская вобласць) унутраны назіральнік браў прамы ўдзел у стварэнні перашкодаў працы групы назіральнікаў ад АБСЕ.

Незарэгістраваная грамадзянская ініцыятыва «Партнёрства» займалася заслугоўваўшым давер незалежным унутраным назіраннем, пачынаючы з 1 ліпеня 2004 года. Яе доўгатэрміновыя назіральнікі былі зарэгістраваныя ў 98 выбарчых акругах з дапамогай выкарыстання палажэнняў Выбарчага кодэксу, якія дазваляюць грамадзянам станавіцца назіральнікамі шляхам збору 10 подпісаў выбаршчыкаў у акрузе. Больш за 3000 кароткатэрміновых назіральнікаў ад дадзенай групы прайшлі рэгістрацыю для назірання на працягу пяці дзён датэрміновага галасавання і непасрэдна ў дзень выбараў. У сувязі з адсутнасцю ў яе афіцыйнага статусу зарэгістраванай арганізацыі, кароткатэрміновыя назіральнікі «Партнёрства» праходзілі акрэдытацыю альтэрнатыўнымі спосабамі, такімі як збор подпісаў або вылучэнне ад мясцовых няўрадавых арганізацый. Групы кароткатэрміновых назіральнікаў імкнуліся прысутнічаць на 25 працэнтах выбарчых участкаў у кожнай выбарчай акрузе. ММНВ атрымала некалькі паведамленняў аб прыгнёце ўнутраных назіральнікаў, які меў месца, напрыклад, у Гомеле, Гродне, Магілёве і Наваполацку.

## XII. НАЗІРАННЕ ЗА ГАЛАСАВАННЕМ І ПАДЛІКАМ ГАЛАСОЎ

### A. Датэрміновае галасаванне

На працягу пяцідзённага перыяду датэрміновага галасавання ММНВ правяла 1030 назіранняў на ўчастках для галасавання. Нягледзячы на існаванне шэрагу пытанняў, выклікаўшых сур'ёзную заклапочанасць ступенню празрыстасці працэдуры датэрміновага галасавання, у асобнасці адсутнасць базавых умоў захаванасці матэрыялаў па выбарах і адсутнасць прамога адлюстравання штодзённых лічбаў па яўцы выбаршчыкаў у пратаколе аб выніках галасавання, назіральнікі далі станоўчую адзнаку прайшоўшага працэсу галасавання амаль у 90 працэнтах выпадкаў назірання. Асноўнай праблемай, якая назіралася, былі парушэнні прынцыпа таемнага галасавання (у 9 працэнтах усіх выпадкаў назірання), выкліканыя галоўным чынам адсутнасцю кабін для галасавання (што ва многіх выпадках тлумачылася тым, што датэрміновае галасаванне праходзіла ў іншым памяшканні, чым усталяванае для галасавання ў дзень выбараў) і выпадкамі групавога галасавання. Нягледзячы на тое, што некаторыя з іншых назіраўшыхся праблем, такія як выпадкі дазволу выбаршчыкам галасаваць без прад'яўлення дакументаў, пасвядчаючых асобу, падаваліся працэдурнымі памылкамі, назіраліся таксама сітуацыі, калі людзі мелі па некалькі бюлетэняў. Агітацыйныя матэрыялы па парламенцкіх выбарах прысутнічалі ў памяшканні для галасавання ў 12 працэнтах усіх назіранняў, у той час як матэрыялы, якія прызывалі прагаласаваць «За» на рэферэндуме, прысутнічалі ў памяшканнях для галасавання на многіх выбарчых участках.

З боку ЦВК не паступала даручэнняў аб тым, што скрыні для галасавання павінны быць поўнасцю запячатаныя паміж двума штодзённымі перыядамі, адведзенымі для галасавання, і на нач (калі скрыня павінна была знаходзіцца пад аховай супрацоўніка міліцыі), і ў выніку толькі ў вельмі нешматлікіх выпадках назіральнікі ММНВ адзначалі, што УВК прымалі меры для запячатвання адтуліны ў скрыні на перыяд, калі яна не выкарыстоўвалася. У працэдуры па-ранейшаму адсутнічаў штодзённы запіс аб

удзеле ў датэрміновым галасаванні ў афіцыйным пратаколе. Тым не менш, дзейнічала спецыяльнае палажэнне аб запячатванні адтуліны ў скрыні пасля заканчэння галасавання ў апошні дзень датэрміновага галасавання, таму выклікае заклапочанасць, што ў пачатку галасавання ў дзень выбараў 17 кастрычніка назіральнікі зафіксавалі, што ў 21 працэнце выпадкаў, калі скрыні для датэрміновага галасавання былі навідавоку, такая пячатка на іх адсутнічала[40].

З розных рэгіёнаў паступалі паведамленні аб аказанні на асобныя групы выбаршчыкаў ціску для таго, каб яны прагаласавалі датэрмінова. МНВ БДІПЧ/АБСЕ здолела пацвердзіць паведамленне аб тым, што на студэнтаў Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта аказвалаўся ціск з мэтай, каб яны прагаласавалі датэрмінова. Паступалі заявы аб тым, што студэнты ў горадзе Мінску (Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта, Беларускага дзяржаўнага медыцынскага інстытута), Магілёве і іншых гарадах атрымалі распараджэнне прагаласаваць датэрмінова. Былі арганізаваныя сходы бацькоў школьнікаў у Баранавічах, супрацоўнікаў Тэрытарыяльнага медыцынскага аб'яднання №4 г. Віцебска і працаўнікоў завода «Хімвалакно» у Магілёве, на якіх ім было сказана прагаласаваць датэрмінова.

## B. Галасаванне ў дзень выбараў[41]

Нягледзячы на тое, што працэс галасавання наогул атрымаў станоўчую адзнаку з боку назіральнікаў ММНВ на амаль 90 працэнтах назіраўшыхся імі выбарчых участкаў, а членам УВК аддавалася належнае за эфектыўнасць іх працы, некаторыя сур'ёзныя праблемы былі прэвалюючымі: на 13 працэнтах выбарчых участкаў прысутнічалі неўпаўнаважаныя асобы (на 2 працэнтах участкаў было заўважана, што яны кіравалі працай УВК); на 6 працэнтах участкаў мелі месца выпадкі дазволу выбаршчыкам прагаласаваць без прад'яўлення дакумента, які пасвядчае асобу; на 7 працэнтах участкаў назіралася неналежнае апячатванне альбо цэласнасць скрыняў для галасавання. На 30 працэнтах участкаў назіраліся выпадкі парушэння таямніцы галасавання, калі ў кабіне для галасавання адначасова знаходзілася больш за адну асобу (пры іншых абставінах, чым дазволенае аказанне дапамогі ў запаўненні бюлетэня). Назіралася таксама некалькі выпадкаў неаднаразовага галасавання[42]. Прысутнасць агітацыйных матэрыялаў у памяшканнях для галасавання істотна скарацілася ў параўнанні з перыядам датэрміновага галасавання, калі яна была распаўсюджаным.

Выклікалі турботу выпадкі прымусу людзей да галасавання. Самы абуральны выпадак адбыўся на ўчастку №21 у выбарчай акрузе АВК №81 (Жодзінская, Мінская вобласць), калі спецыяльны участак для галасавання быў утвораны ў шпіталі, і назіральнікі ММНВ распавядалі, як мядсёстры выводзілі пажылых пацыентаў - некаторыя з якіх былі яўна немачнымі і з цяжкасцю перасоўваліся - у пакой для галасавання, а адну жанчыну нават прынеслі ў пакой для галасавання на насілках адразу пасля родаў. Назіральнікі таксама адзначалі, што ніхто на дадзеным участку не галасаваў таемна з прычыны адсутнасці на ім кабін для галасавання. На ўчастку №432 у выбарчай акрузе №105 (Старавіленская, горад Мінск) назіральнікі сталі сведкамі таго, як дваім выбаршчыкам, якія выказалі жаданне прыняць удзел толькі ў парламенцкіх выбарах, было адмоўлена ў магчымасці не атрымоўваць бюлетэні па рэферэндуме. На ўчастку №43 у акрузе №4 (Баранавіцкая-Заходняя) назіральнікі бачылі, што вайскоўцы галасавалі ў прысутнасці свайго камандзіра.

---

[40] У адпаведнасці з патрабаваннямі ЦВК скрыня для датэрміновага галасавання павінна знаходзіцца ў поле зроку пры адкрыцці ўчасткаў для галасавання ў дзень выбараў і на яго працягу. У рэчаіснасці ж гэта назіралася толькі на 57 працэнтах 112 выбарчых участкаў, на якіх назіралася працэдура адкрыцця ўчасткаў у дзень галасавання.

[41] ММНВ назірала за ходам галасавання на каля 1100 выбарчых участкаў.

[42] На ўчастку №8 у акрузе №7 (Белавежская); участку №50 у акрузе №48 (Светлагорская); участку №36 у акрузе № 80 (Дзяржынская); участках №№25 і 26 у акрузе №84 (Мінская сялянская).

Па некаторых пытаннях выклікла заклапочанасць працэдура галасавання па месцы знаходжання выбаршчыка. У 15 працэнтах выпадкаў назірання за адкрыццём участкаў для галасавання ў дзень выбараў не было прадэманстравана, што пераносная скрыня пустая і апячатаная, што з'яўляецца часткай працэдуры адкрыцця. На сямі ўчастках для галасавання назіральнікам альбо паведамлялі супрацоўнікі УВК, альбо яны самі непасрэдна бачылі, што пераносная скрыня выносілася для галасавання без адпаведнай просьбы выбаршчыкаў, што патрабуецца па закону[43].

## C. Падлік галасоў

Працэдура падліку галасоў назіралася на 120 участках для галасавання, і ў 62 працэнтах выпадкаў назіральнікі ММНВ далі ёй негатыўную ацэнку. Паўсюдна назіралася адсутнасць празрыстасці пры ўсталяванні вынікаў і складанні пратаколаў: толькі ў дзесяці выпадках назірання УВК да адкрыцця скрыняў для галасавання прытрымліваліся ўсталяванай працэдуры і запісвалі колькасць выбаршчыкаў, якія маюць права галасаваць, і колькасць выбаршчыкаў, якія атрымалі бюлетэні. Падлік бюлетэняў, часцей за ўсё, праходзіў моўчкі, часам нават употай: толькі ў адным выпадку назірання падлік галасоў праходзіў з абвяшчэннем услых выбара, зробленага выбаршчыкамі ў бюлетэнях, і ледзьве у 20 працэнтах выпадкаў агульная колькасць галасоў, адданых за кожнага з кандыдатаў, абвяшчалася ўслых да складання пратакола.

Было зафіксавана восем выпадкаў, калі пратакол спачатку запаўняўся алоўкам з выкарыстаннем гумкі або УВК складалі яго чарнавы варыянт, што з'яўляецца парушэннем прама выражанага палажэння працэдурных правілаў, усталяваных ЦВК. На выбарчым участку №2 у акрузе №50 (Ваўкавыская, Гродзенская вобласць) пратакол быў складзены старшынёй УВК у асобным пакоі пасля атрымання лічбаў на аркушах паперы ад іншых членаў камісіі ў пакоі для падліку галасоў. На ўчастку №21 у акрузе №9 (Драгічынская, Брэсцкая вобласць) пратакол быў складзены членам УВК па-за памяшканем для падліку галасоў, відаць, пасля тэлефоннай гутаркі з невядомай асобай без належнага падліку галасоў. На выбарчым участку №40 у акрузе №72 (Магілёўская-Цэнтральная) пратакол, відаць, таксама быў складзены без правядзення УВК падліку галасоў.

Ледзьве на палове назіраўшыхся ўчасткаў для галасавання УВК вывесілі копіі пратакола аб выніках для таго, каб назіральнікі змаглі запісаць вынікі галасавання.

На чатырох участках, усё з якіх знаходзіліся ў Брэсцкай вобласці[44], назіральнікі, якія мелі магчымасць бачыць скрыні для галасавання з дастаткова блізкай адлегласці, адзначалі вялікую колькасць бюлетэняў, вымаўшыхся са скрыняў у выглядзе складзеных пачакаў, што сведчыць аб ўкідванні бюлетэняў.

## D. Падвядзенне вынікаў

Даць поўную ацэнку працэсу падвядзення вынікаў было праблематычна з прычыны вялікай колькасці адмоваў прадаставіць назіральнікам ММНВ поўны доступ у АВК. Толькі восем з 26 груп, якія паведамлялі аб назіранні за працэсам падвядзення вынікаў, здолелі пабачыць занясенне дадзеных у табліцы з дастаткова блізкай адлегласці, каб бачыць лічбы, якія ў іх занасіліся з пратаколаў УВК. Прынамсі ў 39 выпадках групы назіральнікаў ММНВ фізічна ўтрымліваліся на адлегласці ад АВК і іх

[43] Выбарчы ўчастак №59 у акрузе №15; участак №50 у акрузе №48; участак №44 у акрузе №50; участак №40 у акрузе №56 (шпіталь); участак №8 у акрузе №79 (шпіталь); участак №4 у акрузе №84; участак №12 у акрузе №85 (шпіталь).
[44] Участак №17 у акрузе №3 (Брэсцкая-Усходняя), участак №14 у акрузе №7 (Баранавіцкая-Заходняя) і ўчасткі №№ 15 і 27 у акрузе №5 (Баранавіцкая-Усходняя).

працы; як мінімум у 26 з іх гэта вылілася ў катэгарычную адмову дазволіць назіральнікам прайсці ў памяшканне АВК.

Назіральнікі ММНВ сталі непасрэднымі сведкамі таго, як АВК №101 (Ясенінская акруга, горад Мінск) сфальсіфікавала вынікі галасавання пасля іх атрымання з УВК №274. Абвешчаныя АВК вынікі былі пастаўленыя пад сумненне назіральнікамі на падставе асабістай беларускамоўнай копіі пратакола дадзеных УВК аб выніках галасавання, падпісанай старшынёй УВК для засведчання яе ў якасці сапраўднай копіі, з якой вынікала, што перамогшы кандыдат набраў на 225 галасоў менш, чым зафіксавала АВК; вынікі па трох іншых кандыдатах не адрозніваліся. АВК адказала, што копія пратакола УВК назіральнікаў з'яўляецца несапраўднай, паколькі зацверджана подпісам толькі старшыні УВК[45]. Улічваючы тую важнасць, якую АВК мелі звычай надаваць сапраўднасці асобных подпісаў у іншых частках выбарчага працэсу (такіх, як вылучэнне і рэгістрацыя патэнцыйных кандыдатаў) МНВ знаходзіць такі адказ выклікаючым глыбокае расчараванне. Копія пратакола УВК №429 па выбарчай акрузе №105 (Старавіленская, горад Мінск), падпісаная старшынёй УВК, паказвала, што кандыдат, які стаў ў выніку пераможцам у дадзенай выбарчай акрузе, заняў другое месца на дадзенам участку, набраўшы 447 галасоў, але Місіі былі прадстаўлены доказы таго, што гэтая лічба была завышана АВК да 656 галасоў, што выводзіла яго на першае месца на выбарчым участку №429[46].

## E. Перашкаджэнне працы назіральнікаў ад АБСЕ

Сур'ёзную заклапочанасць выклікала перашкаджэнне назіральнікам ММНВ у выкананні сваіх абавязкаў па назіранні ва ўмовах дастатковай свабоды перамяшчэння і доступу да інфармацыі. Адмовы членаў УВК паведаміць базавую інфармацыю ў адказ на пытанні, якія з'яўляюцца стандартнай часткай методыкі назірання АБСЕ і не супярэчаць вызначаным ЦВК правам міжнародных назіральнікаў, напрыклад, паведаміць колькасць выбаршчыкаў у спісе, былі неаднаразовымі і паўсюднымі[47]. Назіральнікам ММНВ часта забаранялі набліжацца да матэрыялаў па галасаванні і дазвалялі знаходзіцца толькі ў вызначанай частцы памяшкання для галасавання. Гэтая праблема набыла асабліва востры характар падчас падліку галасоў і ў АВК пры падвядзенні вынікаў.

У дзевяці выпадках перашкаджэнне працы назіральнікаў праяўлялася ў катэгарычнай адмове дазволіць прайсці на ўчасткі для галасавання, размешчаныя ў воінскіх частках або ў памежных зонах[48], нягледзячы на тое, што цэнтральныя ўлады раней запэўнілі МНВ БДІПЧ/АБСЕ ў тым, што будзе выконвацца стандартны прынцып працы місіі, які заключаецца ў поўным доступе на ўсе выбарчыя ўчасткі. Некаторыя назіральнікі сутыкнуліся з варожымі адносінамі да сябе з боку членаў УВК і супрацоўнікаў міліцыі на ўчастках для галасавання; у васьмі выпадках УВК на звычайных

[45] Працэдурнымі правіламі прадугледжваецца, што УІК непасрэдна пасля заканчэння падліку галасоў павінна вывесіць копію пратакола аб выніках галасавання для таго, каб назіральнікі маглі «азнаёміцца» з вынікамі і вырабіць копію «уласнымі сіламі і сродкамі». УВК не абавязаны засведчыць копіі, якія могуць вырабіць назіральнікі. Аднак старшыня УІК №247 у выбарчай акрузе №101 быў у ліку тых 34 старшыняў УВК, якія па сваім меркаванні падпісалі копіі пратаколаў, вырабленыя назіральнікамі ММНВ на падставе вывешаных копій пратаколаў.

[46] Доказы прадстаўлены ў выглядзе лічбаў, вусна абвешчаных АВК, разбітых па выбарчых участках і запісаных партыйнымі назіральнікамі.

[47] На выбарчым участку №1 у акрузе №56 (Лідская гарадская) наглядальнікі чулі, як прысутнічаўшы член АІК сказаў членам УВК "схаваць спіс выбаршчыкаў", калі ўвайшлі назіральнікі.

[48] УВК адмовілі ў доступе на наступныя ўчасткі: участак №30 у акрузе №4 (Баранавіцкая-Заходняя), участак №31 у акрузе №5 (Баранавіцкая-Усходняя), участак №30 у акрузе №25 (Наваполацкая), участак №118 у акрузе №74 (Магілёўская-Прамысловая), участак №114 у акрузе №96 (Свіслацкая) і участак №603 у акрузе №109 (Уручская). Было адмоўлена ў доступе на ўчасткі на памежных тэрыторыях у складзе наступных акругаў: акруга №9 (Драгічынская), акруга №45 (Палеская) і акруга №58 (Мастоўская).

выбарчых участках пагражалі выдаліць з участкаў групы назіральнікаў ММНВ сіламі супрацоўнікаў міліцыі (дзве такія групы складаліся з парламентарыяў ПА АБСЕ) за пытанні з мэтай атрымання базавай інфармацыі, звязанай са спісам выбаршчыкаў або падлікам галасоў[49]. На выбарчым участку №63 у акрузе №32 (Шумілінская, Віцебская вобласць) і ўчастку №568 у акрузе №108 (Каліноўская, горад Мінск) групы назіральнікаў ММНВ былі выдалены і пазбаўлены права назіраць за падлікам галасоў. Як ужо адзначалася вышэй, прынамсі ў 26 выпадках назіральнікам ММНВ не дазволілі прайсці ў АВК для назірання за працэсам падвядзення вынікаў.

## XIII. ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ

Папярэднія вынікі парламенцкіх выбараў былі абвешчаныя раніцай 18 кастрычніка, каля 13 гадзін пасля заканчэння галасавання. ЦВК зацвердзіла канчатковыя вынікі на сваім пасяджэнні 22 кастрычніка пасля разгляда шэрагу скаргаў, якія аспрэчвалі вынікі галасаванні. ЦВК адхіліла ўсе дадзеныя скаргі на той падставе, што парушэнні, аб якіх было заяўлена, насілі неістотны характар і не маглі паўплываць на вынікі выбараў, нават калі б былі даказаны.

На працягу некалькіх дзён пасля выбараў апазіцыя праводзіла ў Мінску вячэрнія несанкцыянаваныя палітычныя дэманстрацыі пратэсту супраць вынікаў выбараў. 19 кастрычніка дэманстрацыя была разагнаная сіламі АМАП з затрыманнем каля 40 чалавек, улічваючы шэраг вядомых апазіцыйных дзеячаў. Лідар АГП Анатоль Лябедзька пры затрыманніі быў моцна збіты супрацоўнікамі АМАП і шпіталізаваны на некалькі дзён.

Паводле канчатковых вынікаў наогул ў выбарах прынялі ўдзел 6297600 выбаршчыкаў, што склала яўку ў 90,14 працэнта, якая павялічылася ў параўнанні з яўкай на прэзідэнцкіх выбарах 2001 года, якая склала 83,86 працэнта. У параўнанні з гэтым, яўка на парламенцкіх выбарах 2000 года склала 60,90 працэнта, што, мабыць, паказвае на адзін з аспектаў уплыву, якое аказала паралельнае правядзенне рэспубліканскага рэферэндуму на парламенцкія выбары.

Агульная лічба яўкі на парламенцкіх выбарах 2004 года ўключае 17,39 працэнта выбаршчыкаў, якія прынялі ўдзел у датэрміновым галасаванні ў перыяд з 12 па 16 кастрычніка. Паводле статыстычных дадзеных, размешчаных на вэб-сайце ЦВК, у горадзе Мінску толькі ў суботу, 16 кастрычніка ў датэрміновым галасаванні прынялі ўдзел амаль 10 працэнтаў выбаршчыкаў, унесеных у спісы. Яўка па датэрміновым галасаванні ў Мінску была самай высокай па краіне, што яўна кантрастуе з тым фактам, што агульная яўка выбаршчыкаў у горадзе Мінску (якая склала 81,62 працэнта) была самай нізкай па краіне. Гэта можа сведчыць на карысць сапраўднасці атрыманых МНВ паведамленняў аб тым, што з розных бакоў прыкладаліся намаганні па прымусу некаторых груп насельніцтва, у асаблівасці студэнтаў, вайскоўцаў і працоўных калектываў, прыняць удзел у датэрміновым галасаванні.

Па выніках першага тура выбараў дэпутаты былі абраныя па 108 з 110 выбарчых акругаў. У выбарчай акрузе №25 (Наваполацкая, Віцебская вобласць) 27 кастрычніка адбыўся другі тур паміж двума кандыдатамі, якія набралі найбольшую колькасць галасоў у першым туры. У выбарчай акрузе №52 (Гарадзенская-Цэнтральная), дзе 17 кастрычніка балатавалася толькі два кандыдаты, ніводны з якіх не набраў неабходных для абрання 50 працэнтаў галасоў, спатрэбілася правядзенне паўторных выбараў.

---

[49] Пагрозы выдаліць назіральнікаў мелі месца на участку №37 у акрузе №27 (Аршанская-Дняпроўская), участку №122 у акрузе № 24 (Шклоўская), участку №1 у акрузе №66 (Быхаўская), участку №53 у акрузе №79 (Вілейская), участку №311 у акрузе №102 (Сухараўская), участках №№ 556 і 571 у акрузе №108 (Каліноўская) і участку №613 у акрузе №110 (Партызанская).

У новым складзе Палаты прадстаўнікоў, першая сесія якой адчынілася 16 лістапада, 12 прадстаўнікоў палітычных партый. Усе гэтыя дэпутаты з'яўляюцца членамі партый, якія падтрымліваюць палітыку цяперашняга ўрада; у Палаце няма ніводнага прадстаўніка апазіцыі. Было пераабрана сорак шэсць дэпутатаў папярэдняга скліканя, балатаваўшыхся на новы тэрмін. Пераважная большасць абраных дэпутатаў ішлі на выбары пры падтрымцы працоўных калектываў; 100 абраных дэпутатаў вылучаліся альбо толькі ад трудавога калектыва, альбо ад трудавога калектыва і з дапамогай збору подпісаў. Толькі 14 кандыдатаў здолелі стаць парламентарыямі, выкарыстаўшы толькі адзін шлях вылучэння.

Табліца 1: Новы склад Палаты прадстаўнікоў

| Колькасць абраных дэпутатаў | Пол | | Дэпутаты папярэдняга склікання | | Дэпутаты з партыйнай прыналежнасцю | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Мужчынскі | Жаночы | Удзельнічала | Абрана | АП | КПБ | ЛДП |
| 109 | 77 | 32 | 56 | 46 | 3 | 8 | 1 |

## XIV. РЭКАМЕНДАЦЫІ

Ніжэйшыя рэкамендацыі прапаноўваюцца беларускім уладам для падтрымкі будучых намаганняў па паляпшэнні працэса правядзення выбараў. Сярод іх прысутнічае шэраг рэкамендацый, упершыню дадзеных пасля парламенцкіх выбараў 2000 года ў Рэспубліцы Беларусь, якія застаюцца актуальнымі да прыняцця ўладамі адпаведных мераў. Калі дадзеныя рэкамендацыі былі прапанаваныя ў першы раз, БДІПЧ/АБСЕ адзначала, што без палітычнай волі для паляпшэння агульных умоваў, у якіх праходзяць выбары ў Беларусі, паляпшэнні тэхнічнага характару будуць вельмі малаэфектыўнымі. Дадзеная заўвага застаецца слушнай і пасля выбараў 2004 года. БДІПЧ/АБСЕ настойліва заклікае ўрад Беларусі выканаць дадзеныя рэкамендацыі, каб выбары ў Беларусі адпавядалі абавязальніцтвам АБСЕ.

### A. Прававая аснова

1. Варта скасаваць неабгрунтаваныя абмежаванні асноватворных правоў на свабоднае самавыражэнне, свабоду сходаў і аб'яднанняў і ўнесці адпаведныя змяненні ў Выбарчы кодэкс і іншыя акты заканадаўства. У прыватнасці, варта выключыць або істотна абмежаваць ва ўжывальнасці артыкул 47 Выбарчага кодэксу, паводле якога агітацыйныя матэрыялы не павінны змяшчаць «абразаў і паклёпу на службовых асобаў Рэспублікі Беларусь і іншых кандыдатаў» і артыкул 49, якая дапускае прыцягненне асобаў да адказнасці за распаўсюджванне неправераных звестак, якія ганьбяць кандыдатаў, і ўскладае на кандыдатаў адказнасць за парушэнні, дапушчаныя іх прыхільнікамі.

2. Варта ўнесці змяненні ва ўсе акты заканадаўства, якія маюць дачыненне да выбараў, улічваючы заканадаўства па забеспячэнні грамадскага парадку, дзеля іх уніфікацыі з Выбарчым кодэксам. У выпадку ўзнікнення неадпаведнасцяў паміж рознымі актамі заканадаўства ў перыяд выбарчай кампаніі Выбарчы кодэкс павінен мець пераважную сілу.

3. Варта правесці ўсебаковую рэвізію Выбарчага кодэксу з мэтай надання працэдурным правілам большай дакладнасці, празрыстасці і аднастайнасці.

4. Варта ўнесці ў Выбарчы кодэкс змяненні для забеспячэння ліберальнага плюралістычнага прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях на ўсіх узроўнях, а не толькі права вылучэння ў іх склад, і перавагу варта аддаваць вылучэнцам партый і кандыдатаў. Прадстаўнікі працоўных калектываў не павінны гуляць ніякай ролі ў правядзенні выбараў.

5. У выніку рэвізіі выбарчага заканадаўства варта забяспечыць незалежнасць выбарчых камісій ад органаў выканаўчай улады, у тым ліку пазбавіць органы дзяржаўнай адміністрацыі выключнага права прызначаць склад выбарчых камісій на адпаведных узроўнях.

6. Варта зацвердзіць аднастайную працэдуру перагляду ўсіх рашэнняў і дзеянняў ЦВК у Вярхоўным Судзе Беларусі, а прымаючым удзел у выбарах асобам даць магчымасць накіроўваць свае скаргі ў суды самых высокіх інстанцый.

7. Варта ўнесці ў Выбарчы кодэкс змяненні з мэтай, каб памер выдаваемай кожнаму кандыдату ў абавязковым парадку сумы сродкаў быў дастатковым для данясення поглядаў кандыдата сваім выбаршчыкам падчас передвыбарчай кампаніі. Акрамя таго, такімі змяненнямі павінна прадугледжвацца празрыстая і падсправаздачная схема прамога атрымання кандыдатамі ўнёскаў на вядзенне кампаніі, у тым ліку з прыватных крыніц.

8. Парог яўкі выбаршчыкаў на выбары варта знізіць да больш умеранага, напрыклад, 25 працэнтаў для першага тура, і поўнасцю скасаваць для другога тура.

9. Варта разгледзець мажлівасць скасавання палажэнняў, якія дапускаюць галасаванне «супраць усіх», з прычыны таго, што сутнасць выбараў заключаецца ў прадстаўніцтве, і, такім чынам, магчымасць прагаласаваць «супраць усіх» цяжка суаднесці са стандартным азначэннем прадстаўнічай дэмакратыі.

10. Варта прызнаць дастатковай цэнтралізаваную дзяржаўную рэгістрацыю палітычных партый і скасаваць патрэбнасць дадатковай рэгістрацыі ў кожнай выбарчай акрузе.

11. Варта дакладна вызначыць падставы для скасавання рэгістрацыі палітычных партый, абмежаваўшы іх крымінальнымі дзеяннямі. Прыняцце рашэння па пытанні аб скасаванні рэгістрацыі павінна знаходзіцца выключна ў кампетэнцыі судоў.

## B. Арганізацыя і правядзенне выбараў

12. Усё рашэнні ЦВК павінны неадкладна прадстаўляцца для ўсеагульнага азнаямлення і карыстання зацікаўленых бакоў. Усё рашэнні ЦВК павінны заставацца размешчанымі на вэб-сайце ЦВК на працягу ўмерана доўгага перыяду часу пасля выбараў, прынамсі да надыходу крайняга тэрміну падачы скаргаў.

13. Выбарчым камісіям на ўсіх узроўнях варта своечасова публікаваць усе важныя дакументы па выбарах для прадастаўлення магчымасці ўсеагульнага азнаямлення і вывучэння. У асобнасці, варта абавязаць УВК прадастаўляць любому назіральніку па патрабаванні копію пратакола аб выніках галасавання, падпісваемага ўсімі членамі УВК неадкладна пасля яго складання. Да сумарных вынікаў галасавання на ўзроўні выбарчай акругі (а на прэзідэнцкіх выбарах - па абласцях і на агульнанацыянальным узроўні) павінны прыкладацца рабочыя пратаколы з падрабязнымі вынікамі галасавання на ўзроўні выбарчых участкаў, што дазволіць любому

грамадзяніну або міжнароднаму назіральніку праверыць дакладнасць вынікаў выбараў ад узроўня выбарчых участкаў да больш высокіх узроўняў.

14. Варта пільным чынам перагледзець форму пратакола аб выніках галасавання. У пратаколе аб выніках павінна ўсталёўвацца прамая адпаведнасць паміж колькасцю подпісаў выбаршчыкаў і колькасцю бюлетэняў.

15. Варта ўнесці ў Выбарчы кодэкс змяненні для таго, каб выяўленыя разыходжанні сталі стандартным прадметам разгляду УВК, і абавязаць УВК праводзіць паўторны падлік бюлетэняў у тым выпадку, калі неадпаведнасці лічбаў не могуць быць растлумачаныя здавальняючым чынам або былі выяўлены сур'ёзныя памылкі пры складанні пратаколаў УВК. Такі паўторны падлік варта праводзіць у прысутнасці ўсіх членаў УВК з прадастаўленнем права прысутнічаць назіральнікам.

16. Варта сур'ёзнейшым чынам разбіраць скаргі аб наўмысных парушэннях Выбарчага кодэксу членамі камісій і ўжываць меры крымінальнай адказнасці.

17. Прызначэнне складу камісій варта праводзіць паводле прынцыпа ўсёабдымнай ірознабаковай збалансаванасці інтарэсаў і такім чынам, каб забяспечыць функцыянальную адасобленасць ад дзяржаўных органаў. Паралельная занятасць у органах дзяржаўнага кіравання павінна быць недапушчальнай. Варта пазбягаць сітуацый, калі ў склад камісіі ўваходзяць людзі з ужо існуючымі прафесійнымі зносінамі, асабліва зносінамі службовага падпарадкавання. Калегіяльнасць як прынцып працы выбарчых камісій павінна засноўвацца на агульнай прыхільнасці выкананню Выбарчага кодэксу і іншых нарматыўных актаў у процілегласць агульнай прыхільнасці забеспячэнню зададзенага выніка, дыктуемага палітычнімі інтарэсамі сілаў ва ўладзе.

18. Межы выбарчых акругаў павінны ўсталёўвацца больш фармальным чынам, напрыклад актам Парламента адзін раз у кожныя 10 гадоў. Змяненне межаў акругі выходзіць за рамкі непасрэднага правядзення выбараў.

19. Галасы, адданыя на тэрыторыі замежных дзяржаваў, варта падлічваць па больш, чым адной акрузе.

20. Пры прызначэнні складу выбарчых камісій прыярытэт варта аддаваць прадстаўнікам палітычных партый. У правядзенні выбарчага працэсу павінны прымаць удзел апазіцыйныя партыі з гарантаванай квотай прадстаўніцтва пры ўмове, што вылучаныя імі прадстаўнікі адпавядаюць патрабаванням дастатковай кампетэнтнасці.

21. Працоўныя калектывы не павінны мець дачынення да вылучэння прадстаўнікоў у склад камісій, кандыдатаў і нават выстаўлення назіральнікаў.

22. Вайскоўцы павінны мець магчымасць галасаваць разам з грамадзянскім насельніцтвам пры адсутнасці назірання з боку сваіх камандзіраў.

## C. Рэгістрацыя кандыдатаў

23. Дзеля пашырэння выбару, які прадастаўляецца выбаршчыкам, працэдура рэгістрацыі кандыдатаў павінна стаць больш ліберальнай і рэгламентавацца такім чынам, каб выключаць самаўпраўства і прадузятасць. Магчыма ўвядзенне грашовага закладу ва ўмераных памерах (напрыклад, 50

мінімальных зарплат), які звяртаўся б пасля атрымання вызначанага ўмеранннага працэнта сапраўдных галасоў. Калі ў якасці спосабу рэгістрацыі працягваць выкарыстоўваць збор подпісаў, то варта ўнесці змяненні ў артыкул 67 Выбарчага кодэксу з тым, каб патрабавалася сабраць фіксаваную колькасць сапраўдных подпісаў, сапраўднасць якіх усталёўвалася б з дапамогай поўнай і аб'ёктыўнай праверкі замест выкарыстання для гэтага выбаркі.

24. Варта скасаваць патрабаванне аб прадстаўленні пры вылучэнні кандыдатуры аб'ёмнай дакументацыі, такой як дэкларацыя аб даходах і маёмасці. Прынамсі, варта дазволіць выпраўленне любых фармальных або неістотных памылак, нават калі прайшло некалькі дзён пасля заканчэння тэрміну прадстаўлення дакументаў для рэгістрацыі.

25. Варта забараніць скасаванне рэгістрацыі кандыдатаў пасля пачатку датэрміновага галасавання.

## D. Перадвыбарчая агітацыя

26. Органы выканаўчай улады не павінны гуляць ніякай ролі, ні «арганізацыйнай», ні якой-небудзь іншай ў перадвыбарчай агітацыі кандыдатаў.

27. Змест праграмных матэрыялаў кандыдатаў не павінен падвяргацца цэнзуры, улічваючы іх канфіскацыю. Кандыдатам павінна быць дазволена магчымасць выбару характару прадстаўлення сваёй кандыдатуры ў рамках заканадаўства.

28. Варта спыніць неабгрунтаваныя падатковыя праверкі, у асобнасці тыпаграфій, і такія формы прыгнёту падчас кампаніі павінны строга спыняцца ў адпаведнасці з законам.

## E. СМІ

29. У Выбарчы кодэкс варта ўключыць палажэнні аб забеспячэнні роўнага доступу кандыдатаў або палітычных партый да ўсіх звязаных з выбарчай тэматыкай перадач, улічваючы навіны і іншыя інфармацыйныя праграмы.

30. Дзяржаўным СМІ варта ўстрымлівацца ад агітацыі ў падтрымку або супраць любых палітычных пазіцый і праяўляць бесстароннасць у асвятленні выбарчай кампаніі і палітычных падзей. Ім варта забяспечыць бесперашкодны доступ да СМІ на недыскрымінацыйнай аснове ўсім палітычным групоўкам і асобам, жадаючым прыняць удзел у выбарчым працэсе.

31. У тым выпадку, калі погляды кандыдата падвергнуліся нападкам або былі скажоныя, дзяржаўным СМІ варта неадкладна прадаставіць яму магчымасць выступіць з абвяржэннем.

32. Колькасць прадастаўляемага бясплатнага часу і фармат вядзення агітацыі ў СМІ павінны прадастаўляць выбаршчыкам дастатковыя магчымасці атрымання інфармацыі аб кандыдатах.

33. Варта перагледзець склад Назіральнай рады па інфармацыйных спорах у мэтах павышэння бесстароннасці і непрадузятасці яе працы.

34. Варта даць дакладнае азначэнне падставам, на якіх могуць быць зачыненыя газеты і іншыя СМІ, выключыўшы з іх палітычныя меркаванні.

## F. Спісы выбаршчыкаў

35. Варта стварыць агульнанацыянальны цэнтралізаваны рэестр выбаршчыкаў з наданнем кожнаму выбаршчыку асабістага ідэнтыфікацыйнага нумара. Рэестр павінен весціся і абнаўляцца рэгулярна і на працяглай аснове, не толькі непасрэдна перад кожнымі выбарамі, дзяржаўным органам, паўнамоцтвы якога былі бы дакладна вызначаныя адпаведнымі палажэннямі разам з паўнамоцтвамі мясцовых аддзелаў рэгістрацыі грамадзян.

36. Варта публічна паведамляць аб змяненнях у спісе выбаршчыкаў, якія адбыліся паміж часам прадстаўлення спісу ў УВК і днём выбараў. Варта перыядычна праводзіць публікацыю перагледжаных лічбаў, сумаваных па АВК, для атрымання карціны па ўсёй краіне.

37. Спісы выбаршчыкаў павінны быць адкрытыя для поўнага ўсеагульнага азнаямлення ў УВК, што з'яўляецца не толькі простым спосабам праверкі іх дакладнасці, але і важнай мерай па ўзмацненні даверу.

38. Выбарчым кодэксам і пастановамі ЦВК павінна забяспечвацца больш вялікая празрыстасць і бесперашкодны доступ да спісаў выбаршчыкаў для ўнутраных і міжнародных назіральнікаў у перадвыбарчы перыяд і ў дзень выбараў.

## G. Працэдуры галасавання

39. Варта ўнесці змяненні ў артыкул 53 Выбарчага кодэксу, з тым, каб (і) абмежаваць магчымасці для датэрміновага галасавання патрабаваннем папярэдняй адпаведнай просьбы, абгрунтаванай істотнымі прычынамі немагчымасці прыбыць на выбарчы ўчастак або ўдзельнічаць у галасаванні з дапамогай пераноснай скрыні ў дзень выбараў; (іі) забяспечыць поўную надзейнасць, празрыстасць і падсправаздачнасць працэдуры датэрміновага галасавання - запячатываць адтуліну ў скрыні для галасавання індывідуальнай незамяняльнай пломбай усякі раз паміж перыядамі галасавання і складаць пратаколы аб выніках галасавання па заканчэнні кожнага дня датэрміновага галасавання, калі такіх больш аднаго.

40. ЦВК варта ўзмацніць меры па забеспячэнні таямніцы галасавання і папярэджанні падманных дзеянняў пры галасаванні па месцы знаходжання выбаршчыкаў. Пераносныя скрыні для галасавання павінны прыносіцца толькі тым выбаршчыкам, якія выказалі просьбу аб аказанні дадзенай паслугі, а колькасць выдаваемых для гэтай мэты бюлетэняў павінна адпавядаць колькасці такіх выбаршчыкаў.

41. Лічбы яўкі па датэрміноваму галасаванню, галасаванню па месцы знаходжання выбаршчыкаў і звычайнаму галасаванню варта ўсталёўваць асобна і занасіць у выніковы пратакол аб выніках галасавання выбарчым камісіям на ўсіх узроўнях. Пасля таго, як гэта будзе зроблена пры падліку галасоў на выбарчым участку, бюлетэні з усіх трох скрыняў варта змяшаць і затым падлічыць вынікі асобных партый/кандыдатаў.

42. ЦВК варта прыняць неабходныя меры па папярэджанні адкрытага галасавання і групавога галасавання. У дапаўненне да адпаведнага інструктажу супрацоўнікаў УВК і іх належнага навучання дадзеным пытанням, ЦВК варта вывучыць, ці з'яўляюцца стандартныя патрабаванні, прад'яўляемыя да памяшкання на выбарчым участку, дастатковымі для папярэджання адкрытага і групавога галасавання, асабліва падчас датэрміновага галасавання і з улікам магчымасці высокай яўкі выбаршчыкаў. ЦВК таксама варта праводзіць адукацыйную працу з выбаршчыкамі па пытанні абавязку галасаваць таемна.

43. Патрабуюцца дадатковыя меры па забеспячэнні большай празрыстасці і надзейнасці працэса падліку галасоў. Аб'яўленне ўслых выбару выбаршчыкаў па кожнаму бюлетэню і агульнай колькасці галасоў, адданых за кожнага кандыдата, і складанне бюлетэняў пачакамі для таго, каб назіральнікі маглі бачыць адзнаку, зробленую выбаршчыкам, з'яўляюцца мінімальнымі з магчымых мер.

44. Варта ўнесці больш вялікую выразнасць і дакладнасць у працэдуру запаўнення УВК пратакола аб выніках галасавання і больш інтэнсіўна навучаць ёй членаў УВК. Працэдурныя парушэнні неабходна даследваць, а парушыўшых закон асобаў прыцягваць да адказнасці.

45. Заканадаўствам павінна быць прадугледжана, што пратаколы аб выніках галасавання на выбарчым участку ў абавязковым парадку канчаткова зацвярджаюцца ў памяшканні выбарчага ўчастка, а любыя змяненні ў змесце пратакола, выкліканыя тэхнічнымі недакладнасцямі, павінны ўносіцца ў прысутнасці поўнага складу ўчастковай камісіі.

46. З дапамогай падрабязных палажэнняў Выбарчага кодексу павінен прама абмяжоўвацца доступ неўпаўнаважаных асобаў, асабліва прадстаўнікоў дзяржаўнай адміністрацыі, ва УВК і камісіі больш высокіх узроўняў на працягу галасавання і падліку галасоў. Выбарчым кодэксам павінна быць усталявана, хто належыць да «неўпаўнаважаных асобаў», альбо ім павінен вызначацца поўны спіс асобаў, неўпаўнаважаных прысутнічаць на выбарчым участку або ў памяшканнях кожнай выбарчай камісіі.

47. Варта ўнесці змяненні ў выбарчае заканадаўства, або ЦВК па ўзгадненні з Міністэрствам унутраных спраў варта выступіць з распараджэннем аб тым, каб супрацоўнікі міліцыі прысутнічалі на выбарчым участку толькі ў выпадку парушэння парадку па адпаведнай просьбе УВК.

## H. Назіральнікі

48. Варта ўнесці змяненні ў Выбарчы кодэкс або азначыць палажэнні (i) аб сродках абароны, якія маюць назіральнікі ў выпадку адмовы ім у іх правах у працэсе назірання; (ii) аб дазволе міжнародным і ўнутраным назіральнікам сачыць за працэсамі галасавання, падліку галасоў і падвядзення вынікаў з дастаткова блізкай для таго, каб пераканацца ў іх правільнасці, адлегласці; (iii) аб патрабаванні задавальняць просьбы міжнародных і ўнутраных назіральнікаў аб прадстаўленні засведчаных копій афіцыйных пратаколаў аб выніках галасавання на ўсіх узроўнях; (iv) аб патрабаванні забеспячэння міжнародным і ўнутраным назіральнікам поўнага доступу на кожны выбарчы участак.

49. Варта ўнесці змяненні ў Выбарчы кодэкс і пастановы ЦВК з тым, каб абавязаць выбарчыя камісіі на ўсіх узроўнях гарантаваць правы назіральнікаў.

50. Групам незалежных унутраных назіральнікаў варта даць магчымасць праходзіць рэгістрацыю і выконваць сваю дзейнасць ва ўмовах, якія адказваюць міжнародным стандартам свабоды аб'яднанняў. Акрэдытацыі груп незалежных унутраных назіральнікаў на ўзроўні ЦВК павінна быць дастаткова для дазволу поўнага доступу да працы выбарчых камісій на ўсіх узроўнях.

## ІНФАРМАЦЫЯ АБ БДІПЧ/АБСЕ

Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека (БДІПЧ) з'яўляецца асноўным інстытутам АБСЕ закліканым аказваць дзяржавам-удзельніцам садзейнічанне ў «забеспячэнні поўнай павагі правоў чалавека і асноватворных свабод, прытрымліванні вяршэнства закона, развіцці дэмакратычных прынцыпаў і (…) пабудове, умацаванні і абароне дэмакратычных інстытутаў, а таксама развіцці талерантнасці ў маштабах усяго грамадства» (Хельсінкскі дакумент 1992 года).

БДІПЧ, размешчанае ў Варшаве (Польшча), было заснавана на Парыжскім саміце 1990 года пад назвай «Бюро па свабодных выбарах» і распачало сваю дзейнасць у маі 1991 года. Адзін год пазней, назва Бюро змянілася ў сувязі з пашырэннем яго мандата, у які ўвайшлі правы чалавека і дэмакратызацыя. Сёння ў штаце Бюро налічваецца больш за 100 спецыялістаў.

БДІПЧ з'яўляецца вядучай арганізацыяй у Еўропе ў сферы назірання за выбарамі. Бюро каардынуе і арганізоўвае накіраванне тысяч назіральнікаў штогадова для ацэнкі выбараў у рэгіёне АБСЕ наконт адпаведнасці нацыянальнаму заканадаўству і міжнародным стандартам. Яго ўнікальная методыка дазваляе правесці паглыблены аналіз усіх аспектаў выбарчага працэсу. З дапамогай рэалізацыі праектаў па аказанні садзейнічання БДІПЧ дапамагае дзяржавам-удзельніцам палепшыць выбарчую інфраструктуру.

Дзейнасць Бюро па дэмакратызацыі ахоплівае наступныя тэматычныя сферы: вяршэнства закона, грамадзянская супольнасць, свабода перамяшчэння, гендэрная роўнасць, падтрымка ў сферы заканадаўства і барацьба з гандлям людзьмі. Штогадова БДІПЧ рэалізоўвае шэраг цэлевых праграм па садзейнічанню дзяржавам-удзельніцам у выкананні большага аб'ёму абавязальніцтваў АБСЕ і развіццю дэмакратычных структураў.

БДІПЧ сочыць за прытрымліваннем дзяржавамі-удзельніцамі абавязальніцтваў АБСЕ ў сферы чалавечага вымярэння і садзейнічае ў паляпшэнні абароны правоў чалавека. Бюро таксама штогадова арганізоўвае шэраг сустрэч, прысвечаных вывучэнню працэса выканання дзяржавамі-удзельніцамі абавязальніцтваў АБСЕ ў сферы чалавечага вымярэння і абмеркаванню асобных тэмаў.

БДІПЧ кансультуе дзяржавы-ўдзельніцы па пытаннях іх палітыкі ў дачыненні да народнасцяў рома і сінці. Бюро спрыяе развіццю патэнцыяла і ўзаемадзеянню абшчынаў рома і сінці і садзейнічае ўдзелу прадстаўнікоў рома і сінці ў органах улады. Бюро таксама служыць цэнтрам абмена інфармацыяй па пытаннях рома і сінці сярод нацыянальных і міжнародных структураў.

Усё мерапрыемствы БДІПЧ праводзяцца ў цеснай каардынацыі і супрацоўніцтве з дзяржавамі-ўдзельніцамі АБСЕ, інстытутамі і палявымі місіямі АБСЕ, а таксама з іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

Дадатковую інфармацыю можна атрымаць на вэб-сайце БДІПЧ (www.osce.org/odihr).